Юрка Каліна ☞ 3



Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВАЛЯНЦІНА ЯКІМЮК ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 45 (2530) Год XLIX | Беласток, 7 лістапада 2004 г. | Цана 2,00 зл.

І. Алексяюк: На жаль, з-за безграшоўя, мы не можам падключыцца да Інтэрнэту. А так, час ад часу, ліст у „Ніву" напісалі б...

Вакол школы ў Новым Корніне ўсюды легкавушкі. Тут дзесяць настаўнікаў ды двух катэхетаў і амаль усе даязджаюць з Гайнаўкі ўласным транспартам.

— Наша школа вядомая хаця б з таго, што тут ужо шэсць дыпламаваных настаўнікаў, — чую ў настаўніцкім кабінеце.

Пакуль няма пагрозы ў яе ліквідацыі. У першым класе шаснаццаць дзетак, праз год прыйдзе 13 першакласнікаў. У параўнанні са старэйшымі групамі, напрыклад, у пятым класе ёсць 7 вучняў, справа выглядае надзейна.

Хоць з другога боку — дэмаграфія палохае! У Новым Корніне вучацца дзеці з паловы Гайнаўскай гміны — усіх 68 навучэнцаў.

Амаль усе даязджаюць з навакольных вёсак: з Трывежы, Дубіч-Асочных, Новага Беразова, Хітрай, Катоўкі.

Прыбралі старыя могілкі

На калідоры красуецца насценная газета з малюнкамі вучняў. Сустрэнем тут цэрквы і манастыры.

— Мы прымалі ўдзел у конкурсе калядак, — адзначае дырэктар Іаанна Алексяюк. У Тарэспалі. І занялі другое і трэцяе месцы. Як на малую, вясковую школу — поспех вялікі.

Пра супрацоўніцтва з бацюшкам з Новага Беразова гаворыць таксама Ева Мароз. Настаўніца вядзе рэгіянальную праграму „Мая маленькая айчына".

— Некалькі разоў мы парадкавалі стары могільнік каля Новага Беразова. Чамусьці жыхары Гайнаўкі ўпадабалі сабе гэтае месца і, замест пашаны, прывозяць сюды друз і смецце.

Акцыя ўпарадкавання могільніка выхаваўчая. Дзеці моцна перажываюць праявы людской непашаны ў такіх месцах.

Традыцыяй школы з'яўляецца праваслаўна-каталіцкая куцця, на якую прыходзяць бацюшка, ксёндз ды бацькі.

— Думаем пра рэгіянальную ізбу, — працягвае Ева Мароз.

Пакуль усе экспанаты знаходзяцца па прыватных хатах, але людзі паабяцалі падараваць іх школе. У арганізацыі школьнага музея дапамагаюць дзеці.

Зразу ў Гайнаўскую белгімназію

Іаанна Алексяюк заклапочаная ўсё слабейшым зацікаўленнем для беларускай мовы.

— Бацькі чамусьці не надта хочуць, каб іх дзеці хадзілі на ўрокі. Кажуць, быццам замнога працы.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Галіна Зянюк

У Новым Корніне шануюць мінулае

Навучанне роднай мовы пачынаецца з другога класа. З верасня запісалася толькі 31 асоба.

— Мы гаворым бацькам пра карысці, — адзначае дырэктар, — што дзякуючы гэтаму прадмету дзеці могуць вучыцца ў белліцэі.

Станоўчыя прыклады нясе само жыццё. Ёсць вучні, якія замест у Дубіны зразу паступілі ў Гайнаўскую белгімназію.

— Вось у мінулым годзе ў белгімназію паслалі дзіця бацькі, якія прыехалі з Польшчы, — адзначае дырэктар, — бо ім не толькі цікава, але і карысна.

У Новым Корніне няма беларусіста. З гэтага навучальнага года ўрокі вядзе русістка Галіна Зянюк. Спадарыня Зянюк родам з Шастакова.

— Лічу, што мы ўсе павінны вывучаць і шанаваць родную мову, — кажа. Вялікую дапамогу аказала ёй сяброўка беларусістка Ірэна Герасімюк з Арэшкава, якая падзялілася індывідуальна апрацаванай праграмай і вопытам.

Пытаю пра супрацоўніцтва з беларускімі арганізацыямі.

— У гэтым годзе мы атрымалі спісак культурных мерапрыемстваў з Гайнаўскага музея, — адзначае спадарыня Алексяюк, — і ўжо ў найбліжэйшы аўторак збіраемся на экскурсію. Паедуць усе дзеці. Настаўнікі адзначаюць, што такія кантакты вельмі іх падтрымоўваюць на духу.

— І заўсёды, калі ў нас ёлка, — дадае дырэктар, — ёсць адна пастаноўка на беларускай мове.

Абеды ўсім дзеткам

У час канікул у школе быў праведзены рамонт і зараз тут чысціня і ўзорны парадак.

Усе вучні (частку фундуе сацыяльная апека) карыстаюцца школьнай сталоўкай (адзін абед каштуе залатоўку).

— Бацькі прывозяць нам бульбу, гародніну, усялякага роду сочыва і садавіну, — кажа Іаанна Алексяюк, — а тыя, што не маюць зямлі, таксама хочуць дапамагчы. Хто паедзе ў „Бядронку" і купіць муку, хто цукар, або іншыя прадукты. Словам — людзі дапамагаюць як могуць.

Школа належыць да ліку нямногіх шчасліўцаў. У падарунку ад прэзідэнта Кваснеўскага атрымала яна дзесяць камп'ютэраў.

— На жаль, з-за безграшоўя, мы не можам падключыцца да Інтэрнэту, — адзначае дырэктар. — А так, час ад часу, ліст у „Ніву" напісалі б.

Ганна Кандрацюк

Конь ☞ 2

Аляксандр Вярбіцкі

Конь які ўжо час спадарожнічаў чалавеку з нялёгкай працы здабываць хлеб. І на сваёй спіне насіў паноў сваіх асвойваць новыя далі. Быў ён і цяглавой машынай, і баявой, і транспартнай. І месца пачэснае ў гісторыі конь заняў: Траянскі конь, Буцафал, Расінант, Каштанка. У Старажытным Рыме каню было нарыхтавана нават месца ў парламенце...

Нацыянальны капітал ☞ 2

Віктар Сазонаў

Спрачаліся неяк на Беласточчыне хлопцы пра тое, чым зараз павінен займацца нацыянальна свядомы беларус. Адны казалі што асветай, мовай, культурай, гісторыяй, што толькі гэта можа ўратаваць нацыю ад выраджэння, пашырыць колы валанцёраў і выхаваць новых беларусаў. Іншыя не згаджаліся. Казалі, што найперш нацыянальна свядомы беларус павінен займацца бізнесам...

Турысты-інваліды ☞ 5

Марк Цыбарт

Прыехалі яны на веласіпедах і інваліднай калясцы. У якасці тэхнічнай базы спадарожнічаў ім легкавы аўтамабіль, якім ехалі жанчыны і дзеці. Групу з больш дзесятка асоб узначальваў брэсцкі мастак Валянцін Болдзенка, які апрача творчасці займаецца таксама турызмам і экалогіяй...

Усе мы згэтуль ☞ 8

Міра Лукша

Пазнаёмілася Гражына з Магмудам, іранскім персам, на тры гады ад яе старэйшым, у Балгарыі, дзе вучылася ў сельскагаспадарчай акадэміі, на агароднiцтве. Ці адразу рашыліся сюды прыехаць? Быў 1990 год, у Польшчы паправілася кан'юнктура, у Іране стала горш. І жывуць у Залуках 14 гадоў...

Семяноўская дзяўчына ☞ 9

Віктар Бура

Маё пісанне звязана з „Нівай", з рэдактарам Георгіем Валкавыцкім, які сярод з нясмеласцю дасланых у рэдакцыю вершыкаў чатырнаццацігадовай вучаніцы Пачатковай школы ў Семяноўцы знайшоў штосьці вартае друку...

Беларускі фільм ☞ 10

Мацей Халадоўскі

Мастацкі фільм „Акупацыя. Містэрыя" беларускага рэжысёра Андрэя Кудзіненкі выклікаў шмат рознагалосся сярод гледачоў нядаўна закончанага XXIII Кашалінскага фестывалю фільмавых дэбютаў „Маладыя і фільм". Карціна 35-гадовага мінчаніна, народжанага ў Брэсце, ужо раней звярнула ўвагу...

Конь і справа рэвалюцыі

Ці ў мала якіх панадных песнях згадваецца пра каня? „Ехаў Ясь на кані...", „Конь бяжыць, зямля дрыжыць...", не згадваючы ўжо пра такога ж песеннага казака. Конь які ўжо час спадарожнічаў чалавеку з нялёгкай працы здабываць хлеб. І на сваёй спіне насіў паноў сваіх асвойваць новыя далі. Быў ён і цяглавой машынай, і баявой, і транспартнай. І месца пачэснае ў гісторыі конь заняў: Траянскі конь, Буцафал, Расінант, Каштанка. У Старажытным Рыме каню было нарыхтавана нават месца ў парламенце. Пад найслаўнейшымі коннікамі, напрыклад, пад царом Пятром, конь ускараскаўся і на помнікі. Чынгісхан гадаў: „Сузіраючы вынесеную маёй воляй бязмежную плынь конскіх мордаў і чалавечых твараў імкнучую ўнікуды па пурпурным у змярканне стэпе, часта пытаю сябе: а дзе ж я ў гэтай хвалі?" У мудрага цара Саламона было тысячу чатырыста калясніц і дванаццаць тысяч коннікаў. Дзед маршала Жукава быў такі дужы, што паднімаў на сваіх плячах кабылу. Кароль Аўгуст II Саксонскі быў такі моцны, што гнуў у руках конскія падковы.

Конь прывозіў свайго вершніка і ў гісторыю. Што б, для прыкладу, мы ведалі пра Чапаева, калі б не было ў яго каня? Мяркую, што нічога, бо калі б нават ён — як камандзір чырвонай дывізіі — меў машыну, дык калі б нават чэкісты не ўспелі яму забраць вадзіцельскі білет, ён усё ж такі ўрэзаўся б ёю не ў гісторыю, але ў першае сустрэчнае дрэва. Мала гаварыць пра Чапаева — рашаючую ролю ў рэвалюцыйным змаганні за светлую будучыню сыграла Першая конармія Будзённага. Нават можна катэгарычна заявіць, што перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі прынеслі не бальшавікі ці іншапляменцы, але менавіта коні.

Чаму ж тады на помніках таго рэвалюцыйнага подзвігу іх, коней, не стала? Чаму на ніводным помніку Ленін, узорам цара Пятра, не шпорыць нейкага наравістага жарабца? Можна сказаць, што на помніках Уладзімір Ільіч, заміж тузаць павадок носьбіту рэвалюцыі, „кажа праўду", але гэта было б акурат няпраўдай.

Конь з ходам сацыялістычнага будаўніцтва і абвастрэннем класавага змагання стаўся ціхенька — крыху інакш чым галосна іншыя рэвалюцыянеры, напр., Троцкі, Зіноўеў ці Каменеў — „злейшым врагом советского народа". Гэта ж ён, калі добра прыглянуцца, быў неадлучным памагатым кулакоў. І ў ходзе рэвалюцыйнага прагрэсу конскаму класу, як антынароднаму элементу, была наканавана ліквідацыя. У ларках гулагаўскіх зон вельмі рэдка паяўлялася адзіненькая вяндліна — конская каўбаса. Можна нават сказаць, што конь дасцігаў тае ж мэты, што і ягоныя таварышы-рэвалюцыянеры.

Конь у славян меў і свайго нябеснага заступніка. У язычніцкі час быў гэта Ярыла, а ў хрысціянскі — святы Юры. Пры царах у Расіі найважнейшай ваеннай узнагародай быў Георгіеўскі крыж — як асаблівая падзяка заступніку шматвяковага чалавечага баявога таварыша. Пад бальшавікамі, у другую сусветную вайну, наступіў невялікі паварот у рэлігійны бок, аднак не была вернута адзнака з заступнікам коней, толькі ўведзены адзіненька ордэн Аляксандра Неўскага, якога іканаграфія прадстаўляе пехацінцам...

Балючаю крыўдай закончылася для каня не толькі рэвалюцыйная дзейнасць. Гэтаксама адплаціў яму чалавек за ўсёй той прагрэс, які ён вынасіў на сваёй спіне. Калісь конь быў важным носьбітам навін — часта седзячы на кані вяшчальнік абнародваў найважнейшыя паведамленні вярхоў. Ранг гэтакага вяшчання асабліва відаць на шахматнай дошцы, дзе пасланец з канём дзяжураць поруч караля і каралевы. У сярэдневякоўі кароль Рычард III за каня гатоў быў аддаць усю Англію. У Кастрычніцкую рэвалюцыю Ленін вяшчаў ужо з трыбуны. У наш час каня замянілі антэнныя вышкі і радыё- ды тэлестудыі. Сёлета ў Польшчы найважнейшай справай для працы чарговай следчай сеймавай камісіі быў бесперапынны доступ у прамы эфір; пра коней не згадвалася, як гэта здарылася пры папярэдняй такой камісіі, калі народ даведаўся, што конь любіць авёс; цяпер гаворка не пра авёс, а пра паліва.

Сёння над зелянеючую „по диким степям Забайкалья" капіталістычную атаву вярнуўся цар, узведзены ў куміры кананічным арэолам. Але ў сузіраемым Чынгісханам бурагане месца конскіх „тварей" трымаюць помнікі іх апошняму табунмейкеру — першаму правадыру рэвалюцыі.

Аляксандр Вярбіцкі

Нацыянальны капітал

Давялося мне прысутнічаць пры адной спрэчцы. Спрачаліся неяк на Беласточчыне хлопцы пра тое, чым зараз павінен займацца нацыянальна свядомы беларус. Адны казалі што асветай, мовай, культурай, гісторыяй, што толькі гэта можа ўратаваць нацыю ад выраджэння, пашырыць колы валанцёраў і выхаваць новых беларусаў. Іншыя не згаджаліся. Казалі, што найперш нацыянальна свядомы беларус павінен займацца бізнесам, бо толькі заможныя прадстаўнікі нашай нацыі могуць выжыць у гэтым складаным свеце самі, даць лепшую сусветную адукацыю сваім дзецям і дапамагчы заняць ім наймацнейшыя дзяржаўныя пасады. І тады адзін мой сябра, паляк па нацыянальнасці, заўважыў, што беларуская нацыя зможа гучна заявіць пра сябе тады, калі беларуская культура і беларускі капітал сустрэнуцца. Мне падаецца, што ён меў рацыю.

Сёння Расія стала працягваць імперскую палітыку, стаўляючы на гэты раз націск на эканамічную і культурную экспансію. Беларускую эканоміку сталі прывязваць да расійскай. Гэтае пытанне ляжала далёка не ў эканамічным полі, больш у палітычным. Галоўным тут было пытанне эканамічнай незалежнасці Беларусі. Быць ці не быць ёй. Малады беларускі бізнес штучна прывязваўся да расійскага. А, як гаворыцца, дзе капітал твой, там і сэрца тваё. Спробы прывязаць беларускую эканоміку да расійскай былі спробамі пазбавіць беларускі незалежніцкі рух сродкаў.

Сёння ўжо можна гаварыць, што гэтыя спробы праваліліся. Прыкладам, імпрэза ў Свіслачы па ўшанаванню памяці змагароў, што палеглі за незалежнасць Бацькаўшчыны. Яна ўжо даўно робіцца на ахвяраванні дробных беларускіх бізнесоўцаў. Беларускі капітал, хоць яшчэ вельмі нясмела і ў вельмі малым прадстаўніцтве пачынае паварочвацца ў бок нацыянальных каштоўнасцей. І калі ён будзе прадстаўлены ў дастатковым аб'ёме, калі ні грантаўская палітыка, ні нейкія вонкавыя ахвяраванні будуць вызначаць накірункі беларускага адраджэння, тады нацыя зможа самарэалізавацца. Зможа ладзіць тыя імпрэзы, якія ёй патрэбныя, выдаваць тыя выданні, якія хоча, праводзіць тую палітыку, якая прынясе ёй карысць. Беларусы ўжо паказалі сябе як згуртаваная супольнасць. Але, на жаль, не беларусы бізнесу.

Беларусы сёння маюць сваіх багатых людзей. Да гэтага класа можна аднесці не толькі бізнесоўцаў, што зарабляюць грошы сваёй працай, але і людзей, што атрымліваюць сродкі на правядзенне нікому на Беларусі непатрэбных праграм, кшталту феміністычных. Гэтыя людзі, невядома з якой нагоды, атаясамляюць самі сябе з нацыянальна-культурнай элітай. Пры гэтым не збіраюцца і ў думках падтрымліваць нацыянальна-культурны рух нават малымі сродкамі. Ды не пра іх размова. З гэтымі ўсё ясна. А вось з кім сябе атаясамляюць сапраўдныя беларускія бізнесоўцы? Найчасцей яны проста добрыя сябры змагароў за беларускасць. А ў сённяшнім свеце, дзе пануе капітал, наўрад ці можа беларус-бізнесовец лічыць сябе сябрам беларуса, які ўсё сваё жыццё прысвяціў адраджэнню нацыі, калі не падтрымлівае яго памкненні фінансава. Бо сваё сяброўства ён мусіць мацаваць тым, што ў яго ёсць — сродкамі на беларускія справы. Бо дзеля завяршэння адраджэнскай працы бракуе толькі нацыянальнага беларускага капіталу.

На шчасце, патроху і нясмела, гэты капітал ужо пачынае паварочвацца ў бок беларускіх спраў. І толькі тады можна будзе гаварыць пра поспех, калі кожны прадстаўнік беларускай нацыянальнай эліты (культурнай, палітычнай, фінансавай) зможа ахвяраваць нечым дарагім для сябе, дзеля свайго народа. Хтосьці навуковай кар'ерай, хтосьці цёплай пасадай, а хтосьці ўласным капіталам...

Віктар Сазонаў
(Гродна)

Вачыма еўрапейца

Памяркоўнасць

Прачытаў я нядаўна ў „Палітыцы" павучальны і нескрываючы крытыку пад адрасам польскага ведамства замежных спраў артыкул аб палітыцы Польшчы ў адносінах да Беларусі. Ягоныя аўтары Войцех Бародзіч-Смалінскі, былы каардынатар праекта „Партнёрства для Еўропы Польшча-Беларусь" і Павел Казанэцкі, старшыня Згуртавання Усходнееўрапейскі дэмакратычны цэнтр паставілі тэзіс, з якім цяжка пагадзіцца. Пішуць яны: „За дакляpацыямі аб «развіванні ўсходняй палітыкі» ў адносінах да Беларусі скрываецца ўсёахопліваючая бязраднасць. Польскае МЗС дзейнічае вельмі выбарачна і непаслядоўна". Адным з прыкладаў таго, што Беларусь для міністэрства не мае вялікага значэння, на іх думку, ёсць факт, што за апошнія два гады тры разы мяняўся ведамасны спецыяліст па гэтай краіне. Таксама дакляраванае зацікаўленне супрацоўніцтвам з няўрадавымі арганізацыямі не выйшла па-за дакляpацыі, хоць была заснавана рада па справах кантактаў з няўрадавымі арганізацыямі. На працягу двух гадоў сустрэлася яна два разы ды без большых эфектаў. Аўтары прыгадваюць таксама, што вельмі істотнае, маруднасць у працах над законам аб падтрымцы працэсу развіцця дзейнасці за мяжой. Дазволіла б яна пусціць у рух фонды, якія ёсць ужо ў распараджэнні, здаецца, усіх краін Еўрасаюза. Выдзелены яны ўжо, напрыклад, на Літве, Латвіі ці Славакіі. Славакі маюць у распараджэнні на гэтую мэту 8 мільёнаў еўра.

Пасля апошніх выбараў і рэферэндуму ў Беларусі прэм'ер Марэк Бэлька і шэф польскай дыпламатыі Владзімеж Цімашэвіч зноўку падкрэслівалі, што няма гаворкі аб аднаўленні кантактаў на афіцыйным узроўні, а найважнейшай будзе падтрымка адкрытага грамадства. Гэта, аднак, магчымае шляхам кантактаў разнародных няўрадавых арганізацый, на беларускім баку дэлегалізаваных, падобна як закрываных незалежных медыяў, якія часта выпаўняюць ролю такіх арганізацый, а ў Польшчы — дзейнічаючых у карысць Беларусі, не маючы падтрымкі з урадавага боку і пры недахопе якой-небудзь канкрэтнай канцэпцыі на іх функцыянаванне ў рамках польскай палітыкі ў адносінах да тае суседкі.

Маю ўражанне, што праблема звязаная з гэтым пытаннем ёсць у свайго роду беларускім комплексе самога міністра Владзімежа Цімашэвіча. Ягоная асцярожнасць у адносінах да недэмакратычных праяў жыцця ў Беларусі і стрыманасць у выказванні пазіцыі наконт гэтых пытанняў, хоць бы ў гучнай форме падтрымкі дзеянняў няўрадавых арганізацый, можна тлумачыць тым, што „ўслухоўваецца" ён у галасы электарату. Чарговыя выбарчыя перамогі з беластоцкіх спісак заўдзячвае В. Цімашэвіч у значнай ступені мясцовым беларусам. Ад таго і больш бяспечна, і з меншай шкодай ды больш па-джэнтльменску ў адносінах да таго электарату якраз выказаць сваю памяркоўнасць у пачынанні радыкальных дзеянняў у адносінах да суседа блізкага сэрцу электарату, нават калі ўсё паказвае на тое, што ў Беларусі пануе дыктатура. Значыць, цяпер у беларускай паслявыбарчай рэальнасці варта захоўваць імідж Польшчы як дзяржавы — у адносінах да Беларусі — у практычных дзеяннях абыякавай і што найбольш пакідаючай свабодную руку няўрадавым арганізацыям, падтрымліваным не больш чым Бруселем.

* * *

Што цікава, у сувязі з паслявыбарчай сітуацыяй у Беларусі, падляшскі маршалак Януш Кішыжэўскі адмяніў планаваны яшчэ ў ліпені візіт усіх польскіх маршалкаў (канвенту) у Гродне і сустрэчу з губернатарамі абласцей Беларусі. Што яшчэ больш цікавае, чуць да выбараў (калі адміністрацыя прэзідэнта Лукашэнкі прыступіла да выбарчых маніпуляцый), дырэкцыя беластоцкай дэлегатуры Найвышэйшай кантрольнай палаты (NIK) прымала інспектараў з адпаведных беларускіх службаў. Варта дадаць, што такі NIK у Беларусі — служба, як найбольш рэжымная, побач КДБ ці судоў. Адбывалася тое, дарэчы, м.інш. у найбольш гарачы пакантрольна-пракурорскі перыяд у адносінах да „Нівы" і пасля кантролю беларускіх школ.

Мацей Халадоўскі

Мы хацелі нешта змяніць

Інтэрв'ю з Юркам КАЛІНАМ.

„НІВА": — *Юрка, ці ў Тваім дзяцінстве ў бацькоўскай хаце быў тэлевізар?*

ЮРКА КАЛІНА: — Не. У нас, у Кашалях, тэлевізар на пачатку сямідзесятых гадоў быў толькі ў маёй хроснай маці і суседа. Маючы шэсць ці сем гадоў трэба было добра падумаць як укрунуцца да іх паглядзець фільм. Дарэчы, вечарам ніхто ўжо не глядзеў кінафільмаў. Пасля васьмі на вёсцы ўсе ішлі спаць. Потым мой бацька купіў тэлевізар, які праз тыдзень проста згарэў. Я ледзь не плакаў. Замянілі нам яго на другі. Трапіўся добры — служыў нам больш за пятнаццаць гадоў. Але з агляданнем былі толькі клопаты. Абавязак памагаць бацькам у полі і гаспадарцы не дазваляў бестурботна знаёміцца са светам далейшым толькі за добра мне вядомую Орлю і Бельск-Падляшскі. У Орлі было нават кіно. На некалькі сеансаў у дзяцінстве ўдалося мне туды патрапіць. Дарэчы, арлянскі кіношнік часта запрагаў сваю кабылу ў воз і ездзіў паказваць фільмы па суседніх вёсках.

— Здаецца мне, што бацькі нашага пакалення бачылі нас усіх лекарамі, інжынерамі, праваслаўнымі святарамі, вайскоўцамі, стаматолагамі, але не журналістамі. Хіба невыпадкова Ты апынуўся ў біялагічна-хімічным класе Бельскага беларускага ліцэя?

— Я хацеў патрапіць у агульны клас, менш там было матэматыкі і фізікі. Але такіх як я, жадаючых патрапіць туды, было зашмат. Мяне проста прыпісалі да біялагічна-хімічнага класа. Хаця родны дзядзька ў сямейных размовах пра маю будучыню заўсёды любіў паўтараць, што бачыць мяне дантыстам: „Праца пэўная. Бацька купіць абцугі і будзеш рваць зубы. Зубы з рота — грошы ў кішэнь". Але нягледзячы на такія аргументы не прыйшлося мне стаць зубалупам.

— Дык што вырашыла пра Тваю зацікаўленасць гісторыяй...

— З дзяцінства сама цікавым мне было слухаць на вясковай лавачцы расповеды мясцовых старажылаў пра наша, мясцовае, беларускае мінулае. Будучы нават ужо студэнтам гісторыі, мяне зусім і не зацікавілі гістарычныя працэсы ў Заходняй Еўропе ці свеце. Я застаўся ў крузе ўсходняга вымярэння цывілізацыйных працэсаў, а ў іх месца прыналежнага нам, беларусам Беласточчыны. Калі пры канцы сярэдняй школы мой бацька даведаўся, што ў крузе маіх зацікаўленняў апрача гісторыі ёсць яшчэ і юрыдычны факультэт, ён заявіў: „Значыць, будзеш судзіць людзей, але памятай, яны могуць адшукаць цябе, прыйсці дахаты і проста забіць". Тады заставалася гісторыя. І на пытанні настаўнікаў: „Чаму вось на гісторыю", я спакойна адказваў, што да нічога другога я непрыдатны.

— І надышоў бурлівы студэнцкі час другой паловы васьмідзесятых гадоў...

— Стаўшы студэнтам і правёўшы студэнцкія практыкі ў школах, я зразумеў, што проста не хачу быць настаўнікам. Такім чынам вырашыў адну з асноўных праблем свайго далейшага лёсу. Але я таксама не ведаў тады, што буду рабіць узамен. На тое чым займаюся сёння безумоўна ўздзейнічала беларускае незалежнае асяроддзе, у якім я апынуўся. Суарганізаванне Беларускага аб'яднання студэнтаў, рэйдаў, атрасін, выдавецкай дзейнасці, а потым удзел у акцыях грамадска-палітычнага кшталту — гэта была школа жыцця. Напэўна не былі ёй здадзеныя экзамены. У тым быў сапраўдны сэнс студыяў. Цікавасць свету, доўгія дыскусіі наконт нашай беларускай меншасці прывялі мяне да таго, што стаў я прафесійна займацца беларускай журналістыкай. Сёння ведаю шмат студэнтаў, якія заканчваюць і па тры факультэты, але ўяўлення пра свет і ўласнай думкі ад іх нават не пачуеш. Відаць, такое пакаленне. Нам проста хацелася нешта зрабіць і змяніць.

— У 2001 годзе Ты апынуўся ў далёкай Партугаліі, дзе за фільм „Чарнобыльцы" з ліку 360 рэгіянальных тэлестанцый атрымаў Ты самую прэстыжную ўзнагароду. Будучы ў Порта, Ты думаў пра свае родныя Кашалі і свой шлях?

— Той год быў для мяне страшэнна цяжкім. Вялікай траўмай для мяне стала тады смерць мамы. Мае думкі ўвесь час кружылі вакол роднага дома. Таксама і ў Партугаліі. Рэалізуючы фільм пра трагедыю звычайных людзей, якія пацярпелі ад Чарнобыля, шмат разоў прыйшлося аглядаць мне цярпенне, боль людзей, якім лёс забіраў усё найдаражэйшае на свеце — жыццё сваіх блізкіх, пакіданне сваіх бацькоўскіх хат. Трагедыя універсальных каштоўнасцей. Каля такога не пройдзеш абыякава. Калі я глядзеў на разбураныя вёскі ў чарнобыльскай зоне, часта лавіў сябе на думцы, што параўноўваю іх да маіх родных Кашалёў. Пасля таго, што бачыў, хацеў я іх уявіць нават прыгажэйшымі за сваю вёску. Чарнобыльская траўма — так лёгка не адпускае. І калі я атрымаў ва ўзнагароду за фільм „Чарнобыльцы" скульптуру вагой у 17 кілаграмаў, апрача духоўных хваляванняў мне рэальна ў зваротнай дарозе прыйшлося і змагацца з канкрэтным цяжарам.

— Але бачанне Беларусі ў Польшчы ці Еўропе адбываецца перад усім праз прызму Аляксандра Лукашэнкі...

— На жаль, так. Мне хацелася б рабіць фільмы пра беларускую культуру, дзеячаў асветы ці навукі, прыроду, але на іх няма зацікаўлення. Грамадска-палітычная рэчаіснасць Беларусі вымушае займацца аднак тэматыкай, якая таксама хвалюе беларускую і еўрапейскую грамадскасць. Ад такой праўды таксама не можна ўцякаць і хавацца. Дарэчы, калі няма беларускага тэлебачання, то можна мець сотні цудоўных сцэнарыяў, але рэалізуецца аднак тое, на што знойдуцца грошы. Дакументальнае кіно — гэта каштоўная справа.

— Не хапае мне ў Тваіх фільмах пошукаў адказу на праблемы нашай беларускай, беластоцкай рэчаіснасці. „Ад мору і голаду" — гэта толькі экзотыка, а не злабадзённая рэчаіснасць...

— Крыху так ёсць. Тое, што зараз адбываецца ў нас вельмі моцна мяне баліць. Працэс паланізацыі ідзе маланкава на нашых вачах. Я разумею, што гэта ўсё трэба запісаць і зняць. Следам нашай адметнасці застануцца пакінутыя намі кніжкі, газеты, дакументальныя запісы на радыё і тэлебачанні. Таму ёсць і ў мяне фільм пра „Бурага", што пакінуў крывавы след у беларускай свядомасці пасля вайны. І кіно пра беларуска-жыдоўскія суадносіны ў міжваенны перыяд. Таксама бежанства не выпушчана з-пад маёй увагі. Вядома, лягчэй рэалізаваць справы, у якіх я аж так моцна эмацыянальна не заангажаваны. Але сёння ніхто на запісанне праўды пра нас не хоча выкласці ані залатоўкі.

— А місія Беластоцкага тэлебачання?

— Запісанае можа быць усё, але Беластоцкае тэлебачанне не мае на гэта сродкаў. Паспрабавалі мы напісаць супольны праект з Алегам Латышонкам і прафесарам Адамам Дабронскім на цыкл дакументальных фільмаў пра польска-беларускія суадносіны на Беласточчыне ў XX стагоддзі. Ніхто пазітыўна не адгукнуўся.

— У такой сітуацыі не хочацца Табе кінуць камеру і клопаты?

— Пакуль не думаў. Тое, што раблю, дае мне сатысфакцыю. Гэта вельмі цікавая праца. А сваёй дарогай лепшых прапаноў пакуль што няма.

— Дзякую за размову.

Размаўляў Яўген Вапа

Юрка Каліна атрымоўвае ўзнагароду аўстрыйскага аддзялення Асацыяцыі „Рэпарцёры без межаў"

Юрка Каліна нарадзіўся ў 1967 г. Пражываў у вёсцы Кашалі Бельскага павета. Закончыў Пачатковую школу ў Орлі, а затым Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім. Абітурыент факультэта гісторыі Філіі Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. У канцы 1980-х гадоў суарганізатар незалежнага, беларускага студэнцкага і палітычнага жыцця на Беласточчыне. Пасля студыяў прафесійна звязаны са штомесячнікам „Часопіс", у якім займаўся, між іншым, злачыннай дзейнасцю польскага ўзброенага падполля ў дачыненні да беларусаў. З паловы дзевяностых гадоў супрацоўнік Варшаўскага тэлевізійнага асяродка. Цяпер працуе на Беластоцкім тэлебачанні, у якім кіруе блокам праграм пра нацыянальныя меншасці. Жонка Міраслава — настаўніца гісторыі. Дзеці — Міхась і Оля — ахвотна вывучаюць беларускую мову ў беластоцкіх школах.

Найбольш вядомыя ўзнагароды за дакументальныя фільмы Юркі Каліны

2001 — „Чарнобыльцы". Гран-пры Еўрапейскага аб'яднання рэгіянальных тэлебачанняў у Порта (Партугалія). Дакументальны фільм „Чарнобыльцы" прысвечаны людзям, якія вярнуліся жыць на забруджаныя ў выніку чарнобыльскай катастрофы 1986 года тэрыторыі ў Беларусі.

2001 — „Ад мору і голаду". Галоўная ўзнагарода I Міжнароднага агляду экалагічных фільмаў „Экарай" у Райградзе. Фільм распавядае пра свет шаптух на Беласточчыне, якія даюць надзею хворым.

2001 — „Ад мору і голаду". III узнагарода на Аглядзе журналісцкага рэпартажу рэгіянальных тэлебачанняў.

2001 — Супольна з Міколам Ваўранюком і Яўгенам Шпакоўскім вылучэнне ў Кракаве на пятым Міжнародным фестывалі этнічнах фільмаў і праграм „У сябе" за праграмную прапанову Беластоцкага тэлебачання.

2002 — „Пагоня за праўдай". Галоўная ўзнагарода аўстрыйскага аддзялення Асацыяцыі „Рэпарцёры без межаў". Фільм распавядае пра праслед незалежных медыяў у Беларусі на прыкладзе двух прыгавораных на турэмнае зняволенне журналістаў гродзенскай газеты „Пагоня" — Міколы Маркевіча і Паўла Мажэйкі.

2003 — „Чарнобыльцы". Гран-пры Міжнароднага фестывалю экалагічных фільмаў „Экафорум" у Бельску-Бялай.

2003 — „Пагоня за праўдай". I узнагарода на Аглядзе журналісцкага рэпартажу рэгіянальных тэлебачанняў.

2003 — „Пагоня за праўдай". II узнагарода на Міжнародным фестывалі дакументальных фільмаў у Любліне. Вылучэнне на Фільмавым фестывалі ў Волядэр у Мексіцы.

2004 — „Апошні дыктатар Еўропы". Узнагарода на Міжнародным фільмавым фестывалі ў Аламунцы ў Чэхіі. Фільм распавядае пра механізмы функцыянавання ўлады Аляксандра Лукашэнкі.

На вуліцах Мінска

К. Майсеня ў бальніцы

Ужо пяць месяцаў (ад 22 чэрвеня г.г.) у бальніцы ў Гайнаўцы на аддзяленні для зацяжна хворых знаходзіцца Канстанцін Майсеня — былы старшыня Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея, дзеяч БГКТ. Хворым апякуецца высокаспецялізаваны персанал. Анастасія Майсеня сардэчна дзякуе ардынатару Міраславе Чыквін, лекарам Анне Алексяюк і Андрэю Зіневічу, загадчыцы медсясцёр Галене Грыгарук ды ўсім медсёстрам і санітаркам за клапатлівую апеку над яе мужам.

Аб Канстанціне Майсеню не забываюць ягоныя сябры па рабоце і грамадскай дзейнасці на беларускай ніве, знаёмыя.

— Мы вельмі радуемся гэтым візітам. І ў мяне, і ў майго Кастуся адразу паяўляюцца слёзы радасці, калі нас наведваюць у так цяжкія хвіліны хваробы майго мужа, — кажа Анастасія Майсеня.

Хвораму чалавеку патрэбна не толькі медыцынская дапамога, але і духовая падтрымка. Аказваюць яе наведвальнікі шпітальнай палаты № 2: працаўнікі Беларускага музея (Ян Карпюк, Іаланта Вішнеўская, Ян Ляшчук, Пётр Гаган), сябры па рабоце і дзейнасці ў Грамадскім камітэце пабудовы музея (Аляксандр Бандарук, Мікалай Бушко, Мікалай Чыквін, Ілья Агіевіч, Васіль Сакоўскі), дзеячы БГКТ (Ян Сычэўскі, Міхась Хмялеўскі, Уладзімір Юзвюк), а таксама ніжэйпадпісаны.

Карыстаючыся нагодай, ад імя Анастасіі і Канстанціна Майсеняў сардэчна дзякую ўсім, хто не забывае іх і памагае змагацца з хваробай.

Віктар Бура

„Зубр" у Белавежы

У Белавежы заснавалі Праваслаўны спартыўны клуб „Зубр" (вул. Спартыўная, 11). Ад 30 чэрвеня г.г. дзейнічае мужчынская футбольная каманда. Удзельнічае яна ў лігавых спаборніцтвах класа „Б". Сыграла яна матчы з футбалістамі, між іншым, з Нараўкі, Міхалова, Сямятыч, Кляшчэляў і Угова. Некаторыя з матчаў выйгралі.

Неўзабаве „Зубр" пашырыць сваю дзейнасць: пачне займацца баскетбольная каманда. У далейшых планах — заснаванне валейбольнай каманды, настольнага тэніса і каманды, якая будзе практыкавацца ў стральбе з лука. Ёсць задума прыцягнуць у клуб асілкаў і стварыць ім умовы для трэніровак.

Старшыня клуба а. Яраслаў Целушэцкі шчыра дзякуе за дапамогу белавежскім гмінным уладам, мясцовай гасцініцы „Двор Сапліцова", варшаўскай фірме „Сандвік", беластоцкай спартыўнай оптавай фірме „Кая", а таксама індывідуальным спонсарам Юрку Лаўрышу і Марку Палешуку.

Цешыць усё большая колькасць ахвотных займацца спортам у Белавежы і ў ваколіцы. У футбольную каманду прыйшлі вучні, м.інш., Лясного тэхнікума ў Белавежы. **(мох)**

Ставім на агратурызм

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Размова з Валянцінай ЯКІМЮК, старшынёй Рады Чыжоўскай гміны, дэпутаткай ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта.

— Неўзабаве міне 2 гады ад часу, калі пачалі Вы кіраваць Гміннай радай у Чыжах. Што ўдалося зрабіць за гэты перыяд?

— Закончылі мы будаваць водаправоды ў Койлах і Курашаве. Мадэрнізавалі і смалавалі многія дарогі. Апошнім часам здалі ў карыстанне новы будынак гміннай установы. Памянялі аконную сталярку ў будынку Комплексу школ у Чыжах. Будзем шукаць грошай на рамонт школьнага будынка ўсярэдзіне і камп'ютэрызацыю Падставовай школы ў Кленіках. Самай вялікай інвестыцыяй на наступны год будзе будова ачышчальні сцёкаў і каналізацыі ў частцы вёскі Чыжы.

— Зараз на вёсках многа беспрацоўных. Пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз цяжка будзе ўтрымацца з працы на невялікіх гаспадарках. Ці ёсць прапанова як паболышыць рынак працы і даць месцы дадатковага заробку жыхарам Чыжоўскай гміны?

— Гміна наша сельскагаспадарчая і таму хочам ставіць на агратурызм. Агратурыстычная дзейнасць павінна даць нашым жыхарам дадатковыя сродкі і стварыць новыя месцы працы. У нашай гміне многа гістарычных аб'ектаў, якія павінны прыцягнуць турыстаў. Аднак неабходны начлежныя месцы і сталовыя, дзе маглі б затрымацца турысты. Нашы жыхары рыхтуюць смачныя стравы, якія можна было паспрабаваць у час археалагічнага фэсту ў Збучы. Праз нашую гміну праходзіць веласіпедны турыстычны шлях.

— Можа плануеце гмінныя інвестыцыі, якія спрычыняцца да большага прытоку турыстаў?

— У гэтым годзе ўдалося нам забяспечыць сродкі на выкананне плана ўпарадкавання ракі Локніцы. Хацелі б мы збудаваць непадалёк Падрэчан 5-гектарнае вадасховішча. Там прыгожыя краявіды, многа зялёных тэрыторый і свежае паветра. Прадбачваем, што ўся інвестыцыя складзе кошт каля 8 мільёнаў злотых. Спачатку трэба было б спраўдзіць дакладна грунт і забяспечыць сродкі на будаўнічыя работы. Так вялікай колькасці бюджэтных грошай не збярэм і таму трэба будзе шукаць спонсараў. Дзеля турызму можна рэалізаваць іншую інвестыцыю. Ёсць асобы зацікаўленыя купляй аборы, распаложанай побач невялікага вадасховішча каля вёскі Лянева. Прадставілі яны праект пераўтварэння гэтай аборы ў культурна-турыстычны цэнтр *(спадарыня Валянціна паказвае мне праект вялікага будынка з паслуговымі і жыллёвымі пакоямі, які знаходзіцца сярод прыгожых краявідаў)*. Будуць там канферэнц-залы, басейн і апартаменты.

— Якімі інвестыцыямі найбольш зацікаўлены сяляне?

— Земляробаў найбольш цікавяць дарожныя інвестыцыі. Няма такой сесіі, каб не было гутаркі аб дарогах. Наколькі можам смалуем дарогі з выкарыстаннем грэсу. Раўняем гравійныя дарогі. На просьбу радных рамантуем вясковыя клубы. Апошнім часам перараблялі электраўстаноўку ў вясковым клубе ў Камяні. У Асоўцы на вясковы клуб мяняем пункт скупкі малака. Хочам, каб у вясковых клубах магла спатыкацца моладзь і старэйшыя асобы, каб арганізавалася там культурнае жыццё.

— У час гмінных сесій здараюцца гарачыя дыскусіі і спрэчкі. Ці тое, што старшынёй Рады з'яўляецца жанчына, дапамагае пераадольваць цяжкасці і кансалідаваць радных вакол найважнейшых спраў у гміне?

— Радныя Чыжоўскай гміны гэта джэнтльмены. Можа, калі гаворыць да іх жанчына, эмацыянальныя выступленні адыходзяць на другі план. Кожны радны мог бы пакрычаць, але і так пастановы прымаем у час галасавання. Калі сярод радных ёсць пашана для другога чалавека і мінімум добрай волі, то дыскусія вядзецца на аргументы. Заўсёды, калі справа ідзе пра выдаткаванне грошай, трэба рабіць выбар. У працы нашай Рады стараемся ў першую чаргу звяртаць увагу на справы, якія датычаць агулу грамадскасці.

— Апрача працы ў Гміннай радзе Вы працуеце медсястрой у Гайнаўскай бальніцы і на сваёй гаспадарцы. Як Вам удаецца знайсці час на ўсе абавязкі і яшчэ займацца сям'ёй?

— Магчыма гэта дзякуючы майму мужу, які не пратэстуе, а замяшчае мяне ў некаторых занятках.

— А можа нешта скажаце пра сваю сям'ю?

— У мяне дзве дачкі і муж. Малодшая дзяўчына вучыцца ў Гайнаўскім белліцэі. Старэйшая дачка, якая таксама закончыла беларускую школу, зараз студэнтка міжнародных зносін у Беластоку. У нас 16-гектарная гаспадарка ў Падрэчанах.

— Чым любіце займацца, калі ў Вас ёсць крыху вольнага часу?

— Люблю чытаць бытавыя раманы і вязаць кручком. Люблю таксама паглядзець цікавыя праграмы па тэлебачанні. Аднак, найчасцей, калі іх паказваюць, я ўжо стомленая.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Канібалізм

Які наш народ, якія мы, беларусы? Ці ставім сабе такія пытанні? Калі так, то вельмі рэдка. Канешне, усе змагаюцца за свой народ, толькі шкада, што кожны па-свойму. Возьмем Беларусь. Слухаючы афіцыйныя звесткі здаецца, што апазіцыя ў краіне гэта найгоршы вораг, шпіёны з Захаду ды Амерыкі і г.д. Дурная аднабаковасць. А ўключыш радыё „Свабода", тым не менш, толькі з другога боку. Вось, скінулі б Лукашэнку, прыйшоў бы рай на Беларусь. Вось, адзіны вораг. Наіўна.

Што найгоршае, усе яны перакананы, што іх праграма найлепшая, што супрацьлеглы бок гэта вораг. І тут з'яўляецца нянавісць. Сіла, якая знішчае ўсё навокал, знішчае нашу мову, нашу культуру, свядомасць. Калі самі сябе пачынаем дзяліць на лепшых і горшых, аўтаматычна штосьці трацім, губляем. І гэты працэс не адбываецца на Беларусі выключна. Не толькі. Паглядзім на Падляшша. Яшчэ некалькі дзесяткаў гадоў беларусы былі тут нашмат больш заўважальныя чымсьці сёння. А дзе іх 150 тысяч падзелася праз 15-17 гадоў. Зніклі? Чаму? Ці сёння так прыціскаюць, калі ты непаляк? Сумняваюся. Прычына іншая. Разлад і сваркі. Вось што. Замест знаёмстваў з гісторыяй, культурай, літаратурай Беларусі, пазнаем перабольшаныя (і няма тут што спрачацца) „факты" з Беларусі аб тым як страшна там жыць. Не кажу, ёсць шмат цяжкасцей, аднак, не так абсурдна як прадстаўляецца. А калі звычайны чалавек пачуе аб тым, што ўсё там валіцца, беспрацоўе, хоць яго няма (2,4%), яно ёсць, што трэба саромецца такой краіны, не дзівота, выракаецца сваіх каранёў. У гэтым яшчэ дапамагаюць усе беларуска-падляшскія арганізацыі. Чаму нельга зрабіць імпрэзу разам? Чаму БГКТ ладзіць сваю, а БАС сваю, чаму няма дыялога паміж беларускай прэсай (якой і так мала) і некаторымі таварыствамі? „Бо яны за, а мы супраць", — думаюць усе.

Давайце грызціся, ненавідзець, так, далей, дзяліцца. Гэта добра. Дыялог не павінен існаваць, уступаць таксама не ўмеем. Навошта? Стрымліваць эмоцыі мы развучыліся. Размаўляць? А што гэта значыць?

А найбольш мы любім з'ядаць адзін аднаго. Як у джунглі, вядома, моцны слабейшага. Вось так і робім, ядзім, аж не памрэ апошні з нас праз сваё замілаванне. **(ў)**

Турысты-інваліды з Беларусі

Сярод шматлікіх турыстаў, якія летам наведалі Беласточчыну, была група турыстаў-інвалідаў з Брэста і наваколля. Прыехалі яны на веласіпедах і інваліднай калясцы. У якасці тэхнічнай базы спадарожнічаў ім легкавы аўтамабіль, якім ехалі жанчыны і дзеці. Групу з больш дзесятка асоб узначальваў брэсцкі мастак Валянцін Болдзенка, які апрача творчасці займаецца таксама турызмам і экалогіяй. Гэта ён з групай паплечнікаў давёў да лячэння 800-гадовага дуба ў Маларыце, а ў нас пракансультаваў будову драўлянага тратуара і панарамнай вышкі ў адным з закуткаў Белавежскай пушчы. З пушчы таксама пачалі яны вандроўку па Падляшшы.

— Мяжу мы перасяклі пасля наведання беларускай часткі Белавежскай пушчы, — сказаў Валянцін Болдзенка. — Былі мы ў Белавежы, наведалі запаведнік і музей. Чарговым этапам была Гайнаўка, адкуль мы падаліся ў бок Кляшчэляў. Там зрабілі мы аднасутачны адпачынак дзякуючы асабліва руплівай апецы а. Мікалая Келбашэўскага — настаяцеля Кляшчэлеўскага прыхода. Абдораныя ім мы падаліся на Грабарку, дзе матушка-ігумення пераначавала нас у доме паломніка. На Святой Гары ўстанавілі мы свой невялікі крыж і падаліся ў Немірова.

Там беларускія турысты перабраліся на другі бераг Буга, у Гнойна, дзе акурат трапілі на юбілей мясцовай добраахвотнай пажарнай каманды. Валянцін Болдзенка ў маладосці некалькі гадоў працаваў пажарнікам, таму ад імя брэсцкіх калег перадаў мясцовым пажарнікам сардэчныя прывітанні. Яго выступленне сабраныя ўспрынялі вельмі цёпла і сардэчна.

Фота МАРКА ЦЫБАРТА

Валянцін Болдзенка

З Гнойна беларускія турысты, пасля шматлікіх клопатаў з рамонтам колаў у веласіпедах і калясцы, падаліся ў напрамку Тарэспаля, дзе вечарам мелі намер перасячы дзяржаўную мяжу. Калі спытаў я пра ўражанні ад пабыўкі на Беласточчыне, Валянцін Болдзенка выказаў радасць, што яго сябры-інваліды не толькі мелі нагоду вандраваць за мяжою, але вывозяць з сабою прыемныя ўражанні.

— Усюды сустракаліся мы з сардэчным прыёмам. У нас не было моўных праблем у кантактах з мясцовым насельніцтвам. Мы вельмі ўдзячны а. Мікалаю Келбашэўскаму, які паставіўся да нас як сапраўдны бацька і сардэчна дапамог, калі нам адмовілі ў прытулку ў манастыры ў Саках.

Валянцін Болдзенка ў будучым плануе вяртанне ў нашае старонне. Хоча ён, каб таксама іншыя турысты маглі пабачыць прыгажосць пейзажу Беласточчыны і радавацца кантактам з тутэйшымі гасцінными і сардэчнымі людзьмі. Да сустрэчы!

М. Ц.

Адноўленая Елянка

Усе памятаем трагедыю, якая выпала на долю Елянкі Гайнаўскага павета ў час ліпеньскага ўрагану. Вецер пазрываў дахі, разбурыў будынкі, нанёс страты ў плёнах, паламаў лес навокал вёскі... Вецер дзьмуў такі моцны, што вёска пасля смерчу была так знішчана, быццам праз яе пракаціўся фронт.

На шчасце жыхарам хутка прыйшла дапамога. Абыякавых да пацярпелых ад стыхіі на Падляшшы амаль не было: памагалі іншыя гміны, гуманітарныя ўстановы, Царква і шмат людзей добрай волі. Дзякуючы дапамозе і высілкам жыхароў вёскі сёння Елянка выглядае намнога лепш, чым перад стыхіяй. Калі ехаць шашою праз вёску, то амаль на кожным доме красуецца новы дах, а большасць халодных будынкаў ужо адбудаваная. Некаторыя нават жартуюць, што сёння Елянка выглядае быццам узорная вёска, якая ў пачатку 1950-х запісалася ў калгас.

Фота МАРКА ЦЫБАРТА

Летняя стыхія не абмінула намоленых месцаў: могільніка пры шашы і крыжоў на акраінах вёскі. Але і гэтыя месцы даволі хутка даводзяцца да парадку. На здымку бачны новы крыж пры ўездзе ў Елянку з боку Кляшчэляў. Аж верыць не хочацца, што вецер знішчыў папярэдні крыж, таксама мураваны, які стаяў на гэтым жа месцы. Яго рэшткі відаць на другім плане, пад плотам.

Прыгожая справа салідарнасць з тымі людзьмі, якія пацярпелі ад стыхіі. Каб толькі доля не давала нам часта нагоды для аказвання такіх пачуццяў!

М. Ц.

А мне мяжа — не перашкода

Я — карэспандэнтка гродзенскага штотыднёвіка „Міліцэйскі веснік". Мае артыкулы асвятляюць рэаліі складанай працы польскіх паліцэйскіх, мытнікаў і памежнікаў. У полі маёй увагі таксама звыклыя палякі з іх радасцямі, праблемамі і нашы суайчыннікі, якія жывуць у Польшчы.

У ліпені гэтага года, з лёгкай рукі Генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Леаніда Каравайкі, я адкрыла для сябе польскую беларускамоўную газету „Ніва". Ведаеце, мароз па скуры прабег, калі я агледзела вачыма старонкі. Расхвалявалася як маленькая дзяўчынка. Так прыемна, што ёсць па-за межамі Беларусі выданне, якое спрыяе падтрымліванню беларускасці, абараняе духоўныя каштоўнасці беларускага народа — родную мову, культурную і гістарычную спадчыну. І заслугоўвае павагі за тое, што трымае марку першай „Нівы", „Нашай нівы", той, што нарадзілася ў 1906 годзе, выдавалася штодзённа на беларускай мове ў Вільні і ставіла сабе за мэту самавызначэнне беларускага народа.

Калі ў мяне пытаюцца, якой я нацыянальнасці, адпавядаю з усмешкай: татарска-ўкраінская руская з Беларусі. Мая кроў акумуліравала ў сабе ўвесь былы Савецкі Саюз. У мяне тыповае беларускае прозвішча. Мая прапрабабуля трапіла на беларускую зямлю з Лодзі. Можа таму мяне заўсёды як магніт прыцягвала Польшча. Тут я спаткала сваё каханне. Тут нарадзіўся мой сыночак Паўлуша. Тут жывуць сардэчныя, шчырыя, прыгожыя людзі.

І ўсё б было нічога, але, чытаючы польскую прэсу, часам складваецца непрыемнае ўражанне, што нейкія сілы вельмі стараюцца пасварыць нашы краіны і робяць гэта дзе адкрыта, дзе хаваючы сваю нелюбоў да нас паміж радкоў. Колькі ж можна здзекавацца над суседзямі? Колькі ж можна шукаць балючыя кропкі на целе маёй краіны? Смакуючы заезджаныя тэмы, гора-журналісты зусім пазабывалі аб звычайных беларусах, якія жывуць адзін з другім у згодзе і ў гармоніі, выхоўваюць дзетак, працуюць, збіраюцца ўсёй сям'ёй за святочным сталом, спяваюць беларускія, украінскія, рускія мілагучныя песні, падымаюць бакал віна за працвітанне Беларусі і ўсіх беларусаў па-за межамі краіны.

А мяжа? Гэта толькі пашпартная фармальнасць. Галоўнае, я лічу, не адмежавацца ад сваіх замежных сваякоў у думках, трымацца здаля ад брудных гульняў палітыкаў, што нішчаць добрасуседскія адносіны паміж Польшчай і Беларуссю і шанаваць свае карані.

Наталля Антончык, Гродна

Без кантрабанднага алкаголю

У „Нашай ніве" прачытаў я калісьці, што літоўскія парламентарыі падрыхтавалі законапраект аб легалізацыі вытворчасці і продажу самагонкі, спасылаючыся на аўстрыйскі вопыт. Паводле яго, самагоншчыкам будзе выдавацца спецыяльная ліцэнзія. Цікавая справа!

А нашы самагоншчыкі, хаця ў іх няма ліцэнзіі, распрацавалі такую высокую тэхналогію, што ў хатніх умовах умеюць зрабіць якасны напой на 55 градусаў. А п'е самагонку не толькі простанароддзе, але таксама высокае чынавенства, якое аддае перавагу першаку з дадаткам зуброўкі або буквіцы. Ад высакаякаснай самагонкі не баліць галава, не мучыць пахмелле. Добра зробленай самагонцы нават манапалёўка не дакажа.

Гэтага не скажаш пра алкаголь, які прывозяць з Беларусі або Украіны. Адзін дзядзька з прыпушчанскай вёскі заняўся перапродажам кантрабанднага алкаголю. Спірт пастаўлялі яму ў каністрах. У выніку атрыманая пасля разбаўлення з вадою гарэлка мела смак саляркі. Адзін мужык, напіўшыся такой атруты, некалькі гадзін ванітаваў, аж змяніўся на твары.

Вывад з гэтага такі — не купляйце кантрабанднага алкаголю! Калі ўжо хочаце выпіць, то толькі манапалёўку з магазіна або самагонку з буквіцай.

Максім Дрозд

Каналізацыя

У Дубічах-Царкоўных поўным ходам ідуць працы па каналізацыі вёскі, дзе амаль усе жыхары захацелі мець у сябе гэтую гарадскую выгаду, калі за прыроднай патрэбай не трэба хадзіць надвор, а аформіць яе ў туалеце. Я яшчэ далёка ад такога засмуроджваючага хату камфорту, бо хапае сіл выйсці і навонкі. Аднак хочацца шчыра падзякаваць выканаўцам каналізацыйных работ, нашым хлопцам з бельскай фірмы „Ekoinsbud". Яны працу выконваюць хутка, спрытна і чыста, з дапамогай найноўшай тэхнікі і неўзабаве работы будуць закончаны. Тады наша вёска мо будзе выглядаць не горш ад якога мястэчка.

Мікалай Панфілюк

Крызісная дамова

Управы горада і гміны ў Бельску-Падляшскім забавязаліся дафінансаваць па 30 тысяч злотаў „Праект сістэмы крызіснага кіравання ў Падляшскім ваяводстве ў рамках Стратэгіі кіравання памежжам", а дакладней — Цэнтр крызіснага кіравання, размешчаны ў Павятовай камендатуры Дзяржаўнай пажарнай аховы ў Бельску-Падляшскім. Управа Рады павета даручыла павятовым службам падрыхтоўку дамоў і адпаведных пастаноў на гэты конт.

(мм)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У гайнаўскай „шасцёрцы”

У канцы мінулага тыдня „Зорка” завітала ў Гайнаўку. Да нашых сяброў у ПШ н-р 6.

Калі набліжаўся час сустрэчы, на калідоры ў школе выставілі вартавых. Каб прывітаць мяне. Праўда, школа тут аграмадная (больш за 700 вучняў) і без дапамогі можна заблудзіцца. Асабліва таму, што сустрэча праходзіла ў зале-музеі, які размяшчаецца ў падвале.

На месцы чакала мяне прывітальная насценгазета. На ёй каляровыя выцінанкі-зорачкі і прывітальны лозунг (пры нагодзе дзеці гаварылі пра значэнне слова „зорка”).

Сустрэча пачалася са спектакля — таксама, як сказала настаўніца Людміла Грыгарук — з нагоды прыезду нашай газеты. Выступленне разам пабачылі дзеці другога, чацвёртага і пятага класаў.

Вядучая Кася Грыгарук запрасіла на сцэну наймалодшых. Другакласнікі, пад кірункам пані Беаты Кендысь, выступілі з п’есай *Дзе падзелася смятанка?*

На пачатку дзеткі хваляваліся. З цягам часу ў іх было ўсё больш адвагі. Магда Дарашук з чацвёртага класа прадэкламавала верш *Каляровыя алоўкі*. І сапраўды — у зале запанавала шматколернасць! На сцэну ўляцела рознаколерная „Восень”. У Гайнаўцы пад бокам пушча, дык там, як нідзе, захапляе восеньская палітра фарбаў.

Пяцікласнікі падрыхтавалі п’есу пад загалоўкам *Восень*. У іх не было ўжо трэмы — можа таму, што раней выступілі з ёй у гайнаўскім Беларускім музеі. Спектакль нагадваў турнір-гульню. З дапамогай народных прыказак, прымавак і павер’яў дзеці правяралі сваю кемлівасць. Пытанні, вядома, былі пра восень. Падрыхтавала іх Людміла Грыгарук — настаўніца беларускай мовы, якая ў мінулым навучальным годзе стала лаўрэатам конкурсу „Настаўнік года”.

Вядома, дзяўчаты спявалі і танцавалі. Якія песні? Напэўна большасць з вас ведае апошні кампакт-дыск „Журавінак”. Нашы сябры заспявалі, між іншым, песню пра *Бабульку* на словы Віктара Шведа (*Слаўная, мілая бабулька мая...!*)

І гэта быў толькі пачатак. Цягам наступнай гадзіны мы правялі прэс-канферэнцыю. На гэты раз — гэта дзеці ўвасабляліся ў журналістаў і засыпалі мяне градам пытанняў.

Па-першае — цікавіла сама „Зорка”. Дзеці пыталіся, ці ў нас працуюць дзеці. Гэтае пытанне ўзнікла з-за прысутнасці дзіцячых допісаў і твораў на нашых старонках.

(Мы запрасілі нашых сяброў супрацоўнічаць).

Найбольшае здзіўленне выклікаў узрост „Зоркі”. Дзеці чамусьці думаюць, што яна ва ўзросце рэдактаркі. Інфармацыя — што нашу старонку чыталі ўжо іх бацькі і дзяды — проста ашарашыла!

Чамусьці найбольш пытанняў датычыла мовы.

— А ці ў нашым узросце пані размаўляла з бабуляй па-беларуску?

— Вядома, па-беларуску.

Бо тады ўсе так размаўлялі. Не толькі старыя бабулі і дзядулі — як сёння. Па-беларуску размаўлялі дзеці гуляючы ў хованкі, у час школьных перапынкаў, з мамай і татам.

Чаму ўзнікаюць такія пытанні — падумаеце. Проста — зараз усё змянілася. Толькі бабуля і дзед вучаць сваіх унукаў гаварыць па-свойму.

На канец мы сустрэліся яшчэ ў рэгіянальным зале-музеі. На яго адведзены тры памяшканні. У сярэдзіне — як у казцы. Каляровыя вышыванкі і дываны, ручнікі, прылады. Ёсць карціна з Ваўком і Чырвонай шапачкай, намаляваная народным жывапісцам.

Я даведалася, што ў іх „рэгіянальную ізбу” (так завуць залмузей) настаўнцы часта запрашаюць бабуль. І яны не толькі расказваюць пра даўнейшае жыццё, але і частуюць смакоццем.

Зорка

Лунніік ажываючы

(працяг; пачатак у 44 нумары)

Князь вельмі зацікавіўся. Але старая не ведала, дзе шукаць дзівосную расліну і як ёю карыстацца. Яна толькі ўспомніла, што ў вёсцы жыве зельніца Магдаліна, якая ведае пра ўсе расліны на свеце. Мусіць, і пра той корань.

Князь не мог даць веры, што нехта, ведаючы такую таямніцу, не скарыстае з яе і будзе жыць у галечы. Але сквапнасць перамагла недавер. Хутка перад князем стаяла сялянка-зельніца... Не, яна зусім не была старой, зморшчанай, у лахманах. Князь са здзіўленнем пабачыў маладую жанчыну, стройную і вельмі прыгожую, з цвёрдым позіркам чорных вачэй, і вопратка яе была, хаця звычайная сялянская, але на такой гордай паставе глядзелася як шляхецкая.

Асабліва злавала князя лёгкая ўсмешка, з якой глядзела на яго жанчына. Бач, зусім не баіцца... Відаць, сапраўдная чараўніца! Але ў такім разе і праўда можа падказаць патрэбную расліну!

Князь гатовы быў на дамову з самымі чорнымі сіламі. Гатовы быў аддаць жанчыну на самыя горшыя пакуты, пакуль не адкрые таямніцу.

Але страшыць зельніцу не давялося. Яна сама сказала, што ведае ягонае жаданне, і таемны корань, што паказвае скарбы, будзе ў руках князя. Толькі не так проста атрымаць чароўны корань. Князю давядзецца прайсці шмат выпрабаванняў...

Кульгавы сквапнік загадзя быў гатовы на ўсё. Ён нават паабяцаў зельніцы ўзнагароду. Але Магда толькі насмешна зірнула ў вочы ўладара сваймі пякучымі цёмнымі вачыма і прамовіла, што ў выпадку ўдачы папросіць у князя не грошай, а тое, што яму зусім непатрэбнае.

І князь даў слова, што выканае просьбу Магды.

На паляне, абкружанай пракаветнымі соснамі, у яркім святле поўні чарнавокая зельніца і кульгавы князь стаялі перад пляскатым валуном, і поўня люстравалася ў вялікай чары з вадой, пастаўленай на каменны стол.

„Што выбіраеш, радзіму ці дукаты?" — строга прамовіла жанчына. І князь пабачыў у чары, нібыта ў круглым люстэрку, нашу прыгожую зямлю, як з птушынага палёту — яе замкі, палацы і храмы, бярозавыя гаі і цёмныя пушчы, чыстыя азёры і магутныя рэкі...І такой прыгожай была гэтая карціна, што ў князя ўпершыню ў жыцці варухнулася нешта падобнае да захаплення... Але злева пасыпаўся прывідны залаты дождж, і бляск ягоны зацьміў для князя ўсё. „Дукаты! Дукаты выбіраю!"

І адлюстраванне радзімы зацьмілася крывавым туманам. Князю на хвілю падалося, што ён бачыць, як валяцца храмы і гараць лясы, але тут жа ўсё растала ў святле поўні.

„Што выбіраеш — каханне ці дукаты?" — сурова спытала зельніца, і ў чары князь пабачыў аблічча той адзінай у свеце, што з любасцю глядзела на яго. Ён забыў яе імя, і ніколі не спрабаваў адшукаць... Але цяпер, гледзячы ў прамяністыя вочы, упершыню адчуў, што мог зведаць у жыцці — і не зведаў, якое шчасце яго прамінула...Але залаты дождж зноў пераважыў, і постаць жанчыны растала.

(заканчэнне будзе)

Людміла Рублеўская

Атрасіны ў белгімназіі

„Атрасіны" ў нашай гімназіі гэта ўжо традыцыя. Штогод другі клас гімназіі арганізуе першаму класу такое мерапрыемства.

15 кастрычніка 2004 г. мы наладзілі нашым новым сябрам „атрасіны". На пачатак „каты" мусілі перайсці тунель з лавак. Затым нашы сяброўкі памалявалі твары „катам". Вымаляваныя вучні першага класа прыступілі да піцця малака. Як каты, пілі яны малако з місак. У наступнай канкурэнцыі трэба было з'есці яблыкі, завешаныя на вяроўках. Потым мы хацелі ўбачыць, ці вучні першага класа ўмеюць танцаваць. Загадалі, каб яны танцавалі. Дзяўчаты танцавалі пад песню „Макарэна", а хлопцы „Драгостэа дзін тэі". Каб ускладніць танцы, мы пазвязвалі ім рукі і ногі шнуркамі. Танцы атрымаліся ім цалкам добра. З-за таго, што яны прыйшлі вучыцца ў гімназію з беларускай мовай, мы падрыхтавалі ім спецыяльную канкурэнцыю. Першыя класы мелі заспяваць выбраную народную песню, вядома, на беларускай мове. Клас „а" заспяваў песню „Чараўніца", а клас „б" не менш цікавую — „Тры чарапахі". Нам вельмі спадабаўся рэпертуар першакоў. Вучні, якія прайшлі „атрасіны", перасталі быць ужо „катамі", яны — вучні белгімназіі. Пасля „атрасін" адбылася дыскатэка. Іграў Данель Сакоўскі — ды-джэй. Мы вельмі добра гулялі, як на „атрасінах", такі і на дыскатэцы.

Кася і Аніта, II „а" кл. белгімназіі

PS. Прывітанні рэдакцыі „Нівы".

Францішак Кабрыньчук

Кашэчая музыка

Селі каты на плоце,
на інструментах іграюць
і на высокай ноце
цікаўных заклікаюць.

Трывожыць мышак вуха
з музыкамі сустрэча,
уцякаюць, каб не слухаць
той музыкі кашэчай.

Боты

Спрачаліся боты,
стоячы пад лавай:
каторы з іх левы,
а каторы правы.

З польскай пераклаў Віктар Швед

Час рыцараў

Праца і гульні дзяцей

Ці зайздросны лёс дзіцяці часу сярэднявечча?

Ужо з малых гадоў дзяцей прывучалі працаваць. Хлопцы ішлі на навуку да майстра: шаўца, столяра. Дзяўчынкі прывучаліся на краўчыху, служанку. На навуку прафесіі дзяцей адпраўлялі ўжо ў 8-10 гадоў. Таму нямногія хлопцы ўмелі пісаць і чытаць. Пра адукацыю дзяўчынак нават і не думалі!

Малечы, пакуль наняліся на працу, праводзілі час на гульнях. Забаву ладзілі на вуліцы. Іграли ў мяч, у „класы", у гонкі. Дзеці рамеснікаў гулялі ў майстэрнях бацькоў. Са звярынага пухіра (які раздабывалі ў бойні) надзьмухвалі шар, які служыў за мяч.

Калі ў сям'і не ставала грошай, маці шукала дадатковай працы. Калі ў шматлюднай сям'і нараджалася чарговае дзіця, а там не хапала яды, бацькі пакідалі немаўля на парозе багатых мяшчан або на прыступках касцёлаў. Тое, што выжыла, трапляла ў сірацінец.

(працяг будзе)

Зорка

Польска-беларуская крыжаванка № 45

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў, дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

	Marsz		Chomik	Los	Tata		Prezent / Płeć		
Samolot		Mydło		Łapa					Listopad
							Oko		
Rzym				Sowa / Chleb					
Szlak						Orsza			
	Sok / Pensja								
	Pudło								
								Jad	

Адказ на крыжаванку н-р 41: Жарабя, урок, шар, ганачак, кастрычнік, старт, тая, струна, зуб, моц, Ас, паркан, дзяды. Шанс, жар, касцёр, гарт, астра, бант, уран, чытач, удача, князь, крок, боты.

Узнагароды — аўтаручка-карэктар — выйгралі: **Тамаш Парфянюк** з Чаромхі, **Мажэна Баршчэўская**, **Эвеліна Гайко** з Бельска-Падляшскага, **Магда Кандрацюк** з Нараўкі, **Павел Чурак** з Арэшкава, **Анна Раманюк**, **Юстына Аўласюк** з Гайнаўкі, **Ева Багроўская** з Руткі, **Паўліна Паскробка**, **Дарота Цімашук** з Дубін. Віншуем!

Усе мы згэтуль

— Ой, якая багатая восень, усё ў полі ўдалося: жыта ў трубкі павілося, а авёс — як тын парос... — апранае на галаву батыставую хустачку Валянціна Паплаўская, каб задэманстраваць свой убор на дажынкі. На падворку — стол, на стол уязджаюць, каб паказацца, зусім як сапраўдныя грыбочкі з шакаладнымі капелюшамі і пірог, які абселі цеставыя птахі — падарунак самому прэзідэнту ад залучанкі. На падворку хаты пры канцы вёскі вэрхал — бегае пяцігадовы ўнук Данель, ламоча чымсьці, ягоны трынаццацігадовы брат Дарак прабуе ехаць на трактары, сястра Сара-ліцэістка рыхтуецца да выступлення ў „Калінцы", дзед Ясё грукае пад стадолай. А над усім пануе Гражына, дачка Паплаўскіх, радная Гарадоцкай гміны.

Жывуць яны тут усе разам. Хоць Радэшы — Гражына і Магмуд — год таму купілі сабе кватэру ў Беластоку.

— І ездзім як тыя цыганы. Мы на працу (я — у сельскагаспадарчай гандлёвай фірме, муж — дантыстычны тэхнік), дзеці ў школы і садок. Скажу шчыра, мне не вельмі хочацца жыць у Беластоку.

Пазнаёмілася Гражына з Магмудам, іранскім персам, на тры гады ад яе старэйшым, у Балгарыі, дзе вучылася ў сельскагаспадарчай акадэміі, на агароднiцтве. Ці адразу рашыліся сюды прыехаць? Быў 1990 год, у Польшчы паправілася кан'юнктура, у Іране стала горш. І жывуць у Залуках 14 гадоў.

— Як жывецца з мужам-іншаземцам? Напэўна, не так і соладка. Напэўна, выходзяць культурныя адрознасці. Жывём, уладзіліся. Яму было найгорш спачатку, калі не ведаў яшчэ мовы. Цяпер паразумеваецца без праблем. А як дзеці? Дзеці — згэтуль. З бацькавай культурай маюць яны пакуль што няшмат, думаю, калі падрастуць, будуць шукаць.

— Маючы такую слаўную бабулю, пэўна, горнуцца да культуры. Сара і яе дваюрадная сястра Агнешка спяваюць у „Калінцы"...

— І я таксама спяваю, у „Каліне". Дарак удзельнічаў у беларускіх конкурсах, прывёз узнагароду з Гайнаўкі.

— Добрыя ў мяне дзеці, добрая і нявестка, Віктарава жонка, — уключаецца Валянціна. — Сынавая, Эва, родам з-пад Супрасля, таксама ў „Каліне". Усе мы спяваем!

— Наша бабуля — актывістка! — смяецца Гражына. — Праз год — будзе ёй семдзесят.

— Ужо, можа, і стамілася гэтымі арганізацыямі, ды дзе ж кінеш... Не трэба разыходзіцца, каб не прапала.

— Калектыў мама засноўвала з пару іншымі кабетамі. Паездзілі, паспявалі, пабачылі, што па іншых вёсках і ў цэрквах спяваюць. У сённяшні час, калі няма ўжо гаспадарак, дык Залукі — тыповая „спальня". Гаспадароў можа з двух, рэшта — з адной кароўкай, свінкай, трохі зямлі, але яна іх не ўтрымлівае. Дык у дзейнасці можна праводзіць час. Спачатку спявалі ў гурце „Каліна" і дарослыя, і пару дзяўчатак. Цяпер ужо два гурты. Моладзь дзейнічае і ў гарцэрах, выступала з нашымі песнямі і на гарцэрскіх аглядах, і на беларускіх, мелі поспехі. Гэта іх яшчэ больш матывіравала. Дзяўчаты вельмі хораша выступаюць. Вельмі добра, што ў Залуках ёсць школа, якая яднае асяроддзе. Рыхтуецца шмат мерапрыемстваў, усімі сем'ямі, ангажуюцца і настаўнікі. Гэта падтрымлівае сувязі. Удзельнічаюць усе — няма горшых і лепшых. Дзеці ведаюць сваю вартасць, няма з імі праблем, як у вялікіх школах, дзе яны гінуць, ананімныя. Нават нясмелыя дзеткі на сцэне здзіўляюць: во, які артыст! І нашы дзяўчаткі вельмі задаволены з гэтых заняткаў. Няма часу на глупствы. Гэта і натуральны імпульс, каб вывучаць мову і традыцыі дзядоў. І вельмі цешацца выхадцы з Залук, калі чуюць пра актыўнасць нашай вёскі, бачаць нашы выступленні.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Гражына Радэш (стаіць), яе дзеці Дарыюш і Сара, бацькі Валянціна і Ян Паплаўскія. Наймалодшы, непаседлівы Данель, знік па сваіх справах

— Вы згэтуль, як кажаце, дык нашто купілі хату ў Беластоку?

— З думкай аб дзецях. Але не маем яшчэ акрэсленых планаў наконт гэтага, каб туды перанесціся. Здаецца, тут і застанемся. У мяне шмат спраў, каб паафармляць, потым падумаю... На працу — паўгадзіны язды па добрай дарозе. Прыедзеш з работы — сапраўды адпачнеш. Выязджаю перад 7, вяртаюся каля 18. Праўда, заморышся, прыедзеш, зварыш што дзецям... І наступны дзень. Першы год Сары ў ліцэі быў страшны — канчала заняткі каля 19 гадзіны, дык я яе чакала. Але і на басейн дзяцей важу... Круцяцца кіламетры... Можа, з часам будавацца тут пачнем. Вось там, за гэтымі белымі „бэлямі", наш пляц. Месца ёсць.

— Карысна жыць у трохпакаленневай сям'і.

— Быў момант, калі ў нашай хаце было іх чатыры! Мая бабуля жыла амаль сто гадоў, памерла 8 гадоў таму. Хоць недалужная, зыходзіла да праўнукаў. І яны, атрымаўшы штосьці, беглі да яе першай. І яна таксама прыхоўвала найлепшае для іх. Дзяды прападаюць за імі. У старога чалавека, якое б ні было яго здароўе, найважнейшая псіхіка. Аддай яго ў места, у дом апекі — хутка загіне. У сям'і, дзе ёсць дзяды, у маладых іншая свядомасць. Вядома, не заўсёды ідылія, бо ў старэйшых іншы погляд, патрэбы, іншы ў маладых...

— Вам 39 гадоў...

— Чым чалавек старэйшы, тым часцей вяртаецца да каранёў, да месца, дзе нарадзіўся. І мяне ўсё больш сюды цягне...

Міра Лукша

Паэтычнае трохгалоссе

У V выпуску дэкламатарскага конкурсу „Паэтычнае трохгалоссе", арганізаванага 20 кастрычніка ў Бельскім доме культуры, апрача бельскіх вучняў прынялі ўдзел дзеткі і моладзь са школ у Орлі, Аўгустове, Чаромсе і Храбалах. Разам выступілі 53 вучні, якія падрыхтавалі творы на польскай і іншых мовах. Найбольш вучняў рашылася дэкламаваць вершы на беларускай мове. Побач украінскіх твораў можна было пачуць рускую класіку. У гэтым годзе дзеткі адмовіліся ад твораў на мясцовай гаворцы. Мерапрыемства адзначалася вялікай ангажаванасцю дарослых. Намеснік старасты Бельскага павета Пётр Божка чытаў вучням вершы на беларускай мове. Намеснік бельскага бурмістра Міраслаў Галамбёўскі чытаў прозу па-польску, а дырэктар Самаўрадавага прадшколля н-р 9 Альжбета Неліпінская знаёміла сабраных з украінскай літаратурай.

— „Паэтычнае трохгалоссе" падыходзіць да нашай бельскай рэчаіснасці. Інтэгруе яно тры нацыянальнасці, якія жывуць на Бельшчыне — палякаў, беларусаў і ўкраінцаў. Не ва ўсіх школах адбываецца навучанне беларускай або ўкраінскай моў і таму штораз больш вершаў прэзентуюць дзеткі на рускай мове. З беларускімі вершамі выступалі ў мінулых гадах вучні са школ, дзе няма навучання беларускай мовы. Магчыма, што рыхтавалі дзетак бацькі, якія ведаюць беларускую літаратурную мову, — сказаў дырэктар БДК Сяргей Лукашук, які адкрыў конкурсныя спаборніцтвы. На мерапрыемства прыбылі з наймалодшымі дзеткамі іх сямейнікі. Прыйшлі таксама прадстаўнікі нацыянальных культурных арганізацый.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Выступаюць вучні бельскай „тройкі" Юлія Уршуля Скепка і Гжэсь Красоўскі

Сёлета ўзровень дэкламатараў быў высокі. Некаторыя дзеткі паказалі вялікія тэатральныя здольнасці.

— Паявіліся цікавыя, індывідуальныя інтэрпрэтацыі вершаў. Відаць, што былі яны падабраныя па-за падручнікамі, — заявіла кіраўнік аддзялення мастацкай адукацыі БДК Яніна Плютовіч, якая разам з Альжбетай Фіёнік былі ініцыятарамі мерапрыемства.

Конкурсная камісія найвышэй ацаніла і прызначыла першыя месцы **Уршулі Сліўко з Самаўрадавага прадшколля н-р 9 у Бельску** (у катэгорыі вучняў падставовых школ) і **Эдыце Русіновіч з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Орлі** (у катэгорыі гімназістаў). Конкурснай камісіі спадабаліся цікавыя інтэрпрэтацыі ўкраінскага і беларускага вершаў. Маленькая дашкольніца выступіла вельмі адважна, а ў дэкламатаркі з Орлі заўважаны быў вялікі вопыт. Сярод дэкламатараў найбольш было вучняў Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім. Дэкламавалі яны на высокім мастацкім узроўні па-беларуску і па-польску і падабралі разнародныя цікавыя вершыкі. Усе астатнія ўзнагароды (апрача вылучэнняў) атрымалі дзеткі і моладзь з бельскай „тройкі". З ліку вучняў падставовых школ другое месца заняла Юлія Уршуля Скепка, а трэцяе Гжэсь Красоўскі. Сярод гімназістаў другое месца заняла Юліянна Дораш, а трэцяе Аляксандра Лаўранюк. Вялікае ўражанне зрабілі на мне дэкламацыі Юліі Уршулі Скепка і Гжэся Красоўскага. Юлія ў мінулым годзе перамагла ў дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова", а Гжэсь яшчэ раней вылучаўся на беларускамоўных конкурсах. Майстэрскія выступленні Юліянны Дораш і Аляксандры Лаўранюк спадабаліся публіцы. Юліянна разгарнула свае дэкламатарскія здольнасці ў тэатральным гуртку дома культуры, а ўдала прэзентавацца перад публікай навучылася выступаючы з калектывам „Журавінка".

Мерапрыемства арганізаванае было за сродкі бельскага гарадскога самаўрада. Фундатарамі ўзнагарод былі Павятовае староства ў Бельску, Галоўнае праўленне БГКТ, Саюз украінцаў Падляшша, Музей малой айчыны ў Студзіводах і рэдакцыі „Праваслаўнага агляду" і „Нівы".

Аляксей Мароз

Дзяўчына з Семяноўскай школы

З Мірай ЛУКШАЙ, пісьменніцай і журналісткай размаўляе Віктар Бура.

— Раскажыце, Міра, як развівалася Ваша творчая біяграфія.

— Маё пісанне звязана з „Нівай", з рэдактарам Георгіем Валкавыцкім, які сярод з нясмеласцю дасланых у рэдакцыю вершыкаў чатырнаццацігадовай вучаніцы Пачатковай школы ў Семяноўцы знайшоў штосьці вартае друку. Зусім неблагі верш, што магу з прыемнасцю сцвердзіць, калі цяпер, як філолаг, чытаю стары гадавік „Нівы" ад 1973 года, быў надрукаваны ў рубрыцы „Парнасік", крыху такое калыскі літаратурных ніўскіх пачаткоўцаў, з якое „выраслі" пасля такія аўтары, як Міхась Шаховіч, Марыля Базылюк, Юрка Баена... У „Парнасіку" трапляліся розныя мае вершы, м.інш. нават і сатырычныя (палеміка з Дзядзькам Квасам), а да сатыры мяне вельмі хіліла (гэта, мабыць, парадніла мяне з Вандалам Арлянскім). Восенню таго, 1973 года, я дэбютавала на Літаратурнай старонцы „Белавежа", якая была і хронікай навінак, і варштатам для аўтараў згуртаваных у Беларускім літаб'яднанні, сярод якіх некаторыя прамільгнулі адным-двума творамі (каля 300 асоб!), іншыя на ніве роднага слова працуюць да сёння. І я так, пад разумнай далонню (неабавязкова гладзілі па галоўцы), пры шчырай увазе такіх белавежскіх „зуброў", як Георгій Валкавыцкі, Сакрат Яновіч, Юрка Геніюш і іншых, стала я другім пакаленнем „белавежцаў". Трыццаць гадоў — немалы кавал часу. За гэты час выдала я шэсць кніг — тры прозы: *Дзікі птах верабей*, *Выспа* і *Бабскія гісторыі* ды тры лірыкі — *Замова*, *Ёсць* і *Wiersze tutejsze*, якія, хоць на польскай мове, гавораць пра Нашых...

— Ёсць такая гаворка, што паэты вырастаюць — нараджаюцца ў вёсцы.

— Гавораць яшчэ, што няма такой вёскі як у нас нідзе, такой багатай на паэтаў, дзе ў кожнай гміне прынамсі па двух... Праўда, мая вёска маленькая — усяго ў чатыры дамы, дзе ўсе радня — патомкі роду Кастанчукоў. Была я нядаўна ў Баравых, дзе жывуць мае браты Марк ды Яўген, і з чуласцю глядзела на стаўбы аборы, якія мураваў мой дзед Іван, і, даўшы мне цвік, загадаў быў у свежым цэменце вырысаваць дакладныя даты і імёны ды прозвішчы. Іван, сын Івана, унук Дзмітра, і сям'і свае дачкі Зіны — Яна Лукшы, Зіны, Міры і Яўгена (праз пару дзён мела нарадзіцца мая сястра Аліна). Дзяды і ўнукі адчуваюць патрэбу запісаць сваё родавае дрэва. Для памяці. Каб ведалі наступныя. Хто вырэзвае свой помнік у камені, хто рысуе ў цэменце, які, высахлы, будзе як камень — у матэрыялах не вечных, але якія будуць стаяць, абы хтосьці мог прачытаць, што ты быў. І ў слове — якое ў руку не хопіш. Якое азвецца ў чытачы. Нашы вёскі прападаюць, рукатворныя стаўбы часам выглядаюць як валуны Стоўнхендж, а наша слова... Мы ў ім запісваем свае лякі, свае мары, свой народ. Як дзед Іван ды мой прапрадзед Мітрук хочам не пакінуць свайго. Гэта ёсць мудрасць. Пачаткам і крыніцай добрага пісання ёсць яна — мудрасць. Не трэба марнаваць слова. Усё, што напісана ў нас тут па-беларуску — важнае, бо свядомае. Можа, меншы каменьчык на падмурак, часам большы, мацнейшы, як хто ўмее, з залежнасці ад таленту, ад працы. А што ў вёсцы... Кожнае дзіця бачыць тое, чаго не прыкмеціць дарослы. Захапленне, здзіў — творчы пачатак. Кузачка, якая працавіта бегала па пожні, а якую я прыкмеціла, седзячы пад ільняным ляшкам ды плахтай, якою мяне засланіла ад сонца мама рвучы лён, намнога меншая ад мяне, паругадовай малечы, асобная ад мяне ў сваім маленькім космасе і патрэбная, нават неабходная, раптам усвядоміла мне, што і я — неабходная ў гэтым кругавароце дзён малых і вялікіх. Якое гэта важнае было, калі я помню гэта да сёння!

Фота ІАЛАНТЫ КАБЗАР

— Хто з педагогаў першы заўважыў Вашы паэтычныя здольнасці, хто меў уплыў на Ваша творчае развіццё ў школе?

— Школа часцей псуе талент, падтрымлівае „ўраўнілаўку", альбо, наабарот, стварае „куміраў", з якіх пасля адзін „пшык", бо без працы і пэўнай сур'ёзнай увагі да сябе, плёну не будзе. Мы мелі, наш цэлы клас, не самы выбітны і не самы кепскі, але які памятаюць дагэтуль настаўнікі як цэласць, меў шчасце спаткаць такога чалавека, як Марыя Буйко (Вілюк), родам з Палічнай. Прыйшла яна ў Семяноўскую, сваю першую, школу, яшчэ без вопыту. Яна, паланістка і наша выхавацелька, і раскрыла кожнага з нас, можа, і крылы нам дала, бо мы ўсе хацелі, каб яна намі і нашымі поспехамі цешылася. Яна і выступала ў семяноўскім беларускім калектыве. А першым беларускім пісьменнікам, якога я ўбачыла жывога — гэта быў, вядома, Віктар Швед. Завітаў ён у нашу школу разам з „Зоркай" — Янінай Чэрнякевіч. Памятаю, засталася тады на памяць кніга з ягоным аўтографам і свінцовая пласцінка з адлітым радком „Школа ў Семяноўцы", а з такіх алавяных кавалачкаў Вера Папова набірала „Ніву" больш за трыццаць гадоў. Тады не ведала я, дарэчы, маўклівая на сустрэчы, што зведаю, як у друкарні робіцца крок за крокам „Ніва", што маімі калегамі будуць і Віктар Швед, і „Зорка" з „Нівай". Уся „Ніва" стала для мяне школай пасля, была я, вось, адной з першых асоб з другога пакалення ніўцаў, а тут і мы ўжо крыху пастарэлі... Дарэчы, „Ніва" выхоўвала і выхоўвае тых, хто схоча быць аратым на яе старонках... А вялікая школа ў Семяноўцы аджыла свой апошні год... Людзі з Семяноўкі, з Беласточчыны — сустрэтыя на маіх сцежках героі рэпартажаў, іх лёсы — таксама аснова маіх апавяданняў. Хачу іх захаваць у памяці.

— Вы, як чалавек і паэтэса, жывяце больш у якім свеце — рэальным, ці ў сваім унутраным, закрытым ад людскіх вачэй?

— Мы сустрэліся з вамі ў маёй школе. Мы, вучні, вас, спадар Віктар, ведалі як карэспандэнта „Нівы", які ўпарта пытаўся пра рэаліі. Калі я хаджу па рэальных сцежках нашай малой Айчыны — я рэальная, як наша жыццё. А калі пішу, верш таксама — я сябе і свой утнураны свет выводжу да людзей. Значыць, тыя, хто пішуць — яны навідавоку разам са сваім шчасцем і болем.

Гутарыў Віктар Бура

Заўвагі да фэстаў

З адыходам лета скончыўся сезон вясковых фэстаў. На Падляшшы, у параўнанні да іншых рэгіёнаў Польшчы, іх надта многа. Мясцовае насельніцтва ўмее забаўляцца і заўважаць у іх добрыя бакі, якія ў шэрую рэчаіснасць прыносяць ім каляровыя мерапрыемствы арганізаваныя мясцовымі самаўрадамі, грамадскімі арганізацыямі і нацыянальнымі таварыствамі. Некаторыя мерапрыемствы набылі ўжо вядомасць і міжнароднае прызнанне (напрыклад, Басовішча ці Музычныя дыялогі над Бугам у Мельніку), іншыя абмяжоўваюцца да жыхароў адной або некалькіх суседніх вёсак. Але ўсім фэстам уласцівыя сардэчная прыхільнасць да мерапрыемства мясцовага насельніцтва, а таксама жаданне арганізатараў унесці радасць у шэрую рэчаіснасць. Аб ролі фэстаў у падтрымцы мовы і традыцыі бацькоў гаварыць не трэба.

Канешне, я не мог прысутнічаць на ўсіх беларускіх фэстах, якія адбываліся летам, а некаторых, асабліва шматлюдных і гучных, я адмыслова пазбягаў, але на шэрагу мерапрыемстваў я быў і хачу з чытачамі „Нівы" падзяліцца сваімі ўражаннямі.

Найбольш спадабаліся мне археалагічны фэст у Збучы, беларускі пажарніцкі фэст у Стрыках і мерапрыемства ў Ляневе. У Збучы можна было не толькі бавіцца і слухаць блізкія сэрцу песні, але таксама нечаму навучыцца. Адзіным дысанансам на гэтым мерапрыемстве было выступленне гарцэрскага калектыву, які — хаця вядзе яго малады праваслаўны святар — не праспяваў аніводнай няпольскай песні!

Асабліва мілая атмасфера панавала — на маю думку — у Стрыках і Ляневе. Там было відаць, што ў гулянні ўдзельнічаюць старыя і маладыя і што сапраўды ўсе жыхары прыемна праводзяць час. Асаблівая пахвала, паводле мяне, належыцца пажарнікам, якія пры дапамозе гідраўлічнага дамкрата стварылі жыхарам Лянева магчымасць паглядзець на сваю вёску з птушынага палёту.

Фота МАРКА ЦЫБАРТА

Фэст у Ляневе

Менш удалымі лічу фэсты ў Мілейчычах і Драгічыне. У Мілейчычах атракцыёнаў было нямала, але ўсё мерапрыемства было нейкае ненатуральнае, складалася ўражанне, што паасобныя шматлікія нумары праграмы праводзяцца машынальна. У будучым прапаную ў пажарніцкія спаборніцтвы ўвесці элемент канкурэнцыі — папросту трэба запрасіць суседнія пажарныя каманды, а тады спаборніцтвы будуць больш цікавыя. Для дзяцей спатрэбіўся б ілюзіяніст — выступаў ён на фэсце „Развітанне з летам" у Дзядковічах — пэўна падкажуць адкуль яго ўзяць.

Фэст сарганізаваны ў Драгічыне з нагоды юбілею Падляшскага ваяводства аказаўся нудным з прычыны выступлення беластоцкага кабарэ. Артысты паказвалі ў крывым люстры розныя ідыёцтвы перыяду г.зв. народнай улады, што здзіўляла палітычнай „адвагай" і нетактоўнасцю ў адносінах да вялікай часткі цяперашняга чынавенства з камуністычнымі каранямі. Да некалькіх стагоддзяў ваяводства выступленне кабарэ не мела ніякага дачынення.

Бываюць лепшыя і горшыя фэсты. Добра, што яны адбываюцца. Хай будзе іх як найбольш. Каб у будучым пазбегчы слабых бакоў, дастаткова пасля мерапрыемства правесці апытанне ўдзельнікаў, разведацца што падабалася, а што не. Людзі самі скажуць і такім чынам дапамогуць арганізатарам пазбегчы памылак.

Марк Цыбарт

Распрацоўшчыкі паведамляюць, што сайт па задуме пісьменніка павінен будзе слугаваць ідэям пашырэння беларускай літаратуры па ўсім свеце...

al-rybak.mail15.com

Доўгімі восеньскімі вечарамі час ад часу прыходзіць вострае жаданне пачытаць нешта цікавае і ў той жа час блізкае. У думках у тую ж хвіліну ўсплываюць ужо прачытаныя апавяданні і аповесці нашых беларускіх пісьменнікаў. Праўда, не ўсе яны сёння шырока вядомыя масаваму чытачу і тады на дапамогу прыходзіць Інтэрнэт, у прыватнасці сайт пад адрасам: al-rybak.mail15.com.

Выйшаўшы на гэтую старонку, на маніторы вы ўбачыце нешта падобнае на свайго роду куток аб творчасці якога-небудзь пісьменніка ў школьнай бібліятэцы. У даным выпадку гэты „куток" тычыцца пісьменніка Алеся Рыбака. Сайт так і называецца яго электроннай старонкай. Гэта напісана ўверсе на сінім фоне па-англійску і па-беларуску.

У каляровым аздабленні галоўная старонка складаецца з сіняй, жоўтай і светла-жоўтай фарбаў. Вертыкальна яна падзяляецца на дзве часткі. Больш вузкая — злева. Пад англамоўнай назвай сайта размешчаны герб Мінска. Далей фотапартрэт пісьменніка і расповед пра мэту стварэння сайта, адкуль мы можам даведацца, што гэта свайго роду юбілейны падарунак — у пачатку лістапада Алесю Рыбаку спаўняецца 70 гадоў.

Распрацоўшчыкі паведамляюць, што „сайт па задуме пісьменніка павінен будзе слугаваць ідэям пашырэння беларускай літаратуры па ўсім свеце. Таму сайт павінен пастаянна абнаўляцца новымі працамі пісьменніка, а таксама перакладамі на іншыя мовы".

Ніжэй ідуць нешматлікія рубрыкі, якія, шчыра кажучы, не перапоўненыя інфармацыяй. Магчыма гэта з-за таго, што ўсе яны з'явіліся толькі нядаўна і чакаюць больш сур'ёзнага прыкладання рук да іх з боку стваральнікаў. Гэта тычыцца рубрык „Іншыя фотаздымкі" (дзе няма нічога) і „Спасылкі" (дзе ёсць выйсце толькі да сайта гурту „Брама").

Другая частка старонкі значна шырэйшая за першую. Яна ўжо больш прысвечана біяграфіі і творам пісьменніка.

Да „Біяграфіі" вядзе адпаведная спасылка, клікнуўшы на якую вы трапіце на ўжо вядомы нам сайт „Слоўнік". Там і размешчаны кароткі расповед аб жыцці і творчасці Алеся Рыбака, які нарадзіўся многа гадоў таму на Міншчыне.

„Вандруючы" далей па галоўнай старонцы мы „выходзім" да некаторых апавяданняў пісьменніка. Самае першае — раман „Трэба было жыць". Адразу бачна, што ён вельмі вялікі па аб'ёме і таму ўзнікае жаданне пазнаёміцца з ім больш шчыльна. На жаль, праз Інтэрнэт гэта не ўдаецца. Раман не „адкрываецца". Затое „адкрываюцца" ўрывак „Арышт настаўніцы" і апавяданне „Родны парог". Абодва творы пра адны з самых трагічных перыядаў у жыцці беларускага народа ў мінулым стагоддзі — бальшавіцкія рэпрэсіі і фашысцкая навала.

Далей на галоўнай старонцы ідзе рубрыка „Пераклады". Тут таксама, відаць, усё толькі пачынаецца. У рубрыцы пераклад на нямецкую мову аднаго апавядання.

Наступная рубрыка „Публіцыстыка, крытыка, рэцэнзіі". У ёй таксама толькі адзін тэкст — пра лёсы вёсак, у якіх калісьці віравала жыццё, а потым з-за розных прычын сышло яно на нішто.

Нягледзячы на тое, што даны сайт з'явіўся ў Інтэрнэце зусім нядаўна, ён ужо поўнасцю выконвае сваю функцыю — знаёміць з беларускай літаратурай цэлы свет.

Уладзімір Лапцэвіч

Піянерам у шахматах трэба лічыць Давыда Яноўскага. Гэты цікавейшы чалавек нарадзіўся ў 1868 г. у Ваўкавыску...

Беларусь, беларусы...

Пад знакам Каісы

Археалагічныя раскопкі паказалі, што ў шахматы на беларускай зямлі гулялі яшчэ ў XII стагоддзі. Сучасную форму ў Еўропе яны набылі ў XVI веку. Самы вядомы шахматны матч у Беларусі таго часу — партыя Гервасія Вылівахі са Смерцю ў Караткевічаўскай „Ладдзі роспачы". Што ж датычыць рэальнасці, то першыя айчынныя шахматныя гурткі былі створаны ў 1919-1920 гг. у Мінску, Барысаве, Віцебску, Магілёве. Але піянерам у гэтай галіне трэба лічыць Давыда Яноўскага. Гэты цікавейшы чалавек нарадзіўся ў 1868 г. у Ваўкавыску. Цяжка сказаць кім ён сябе лічыў, але з дваццаці трох гадоў Яноўскі жыў у Францыі, якая стала яму другой радзімай. Менавіта ён змагаўся за тытул мацнейшага шахматыста планеты са знакамітым Вільгельмам Стэйніцам, першым чэмпіёнам свету. Давыд Яноўскі быў вельмі блізкім да гэтага тытулу, але яму забракла спагады шахматнай музы Каісы. Іншай жарсцю маэстра былі азартныя гульні. Яноўскі часта наведваўся ў Монтэ-Карла, дзе за ноч мог лёгка спусціць у казіно буйную суму на рулетцы. Хутчэй усяго чэмпіёнам свету ён не стаў з-за няўрымслівасці сваёй натуры.

Першы чэмпіянат Беларусі сярод мужчын быў праведзены ў 1924 годзе — пераможцам стаў ураджэнец Вільні Саламон Розенталь. Цікава, што шахматы ніколі не былі яго асноўным заняткам — Розенталь быў славутым вучоным у галіне дэрматавенералогіі. Пазней айчынная школа выхавала многа вядомых у свеце гросмайстраў. Сама значных поспехаў дасягнуў Барыс Гельфанд. У першай палове 1990-х ён быў у ліку дзесяці мацнейшых маэстра свету, чэмпіёнам Савецкага Саюза і Еўропы сярод юнакоў, пасля пераможцам сусветнай алімпіяды ў складзе зборнай СССР (1990 год). Пазней Гельфанд пераехаў на сталае жыхарства ў Ізраіль і цяпер ён прадстаўляе гэтую краіну.

А найбольш значнай асобай беларускіх шахмат ёсць Віктар Купрэйчык. Ён толькі раз быў чэмпіёнам Беларусі (у 1972 годзе), але некалькі дзесяцігоддзяў быў у эліце. Купрэйчык ніколі не перамагаў на буйных міжнародных індывідуальных турнірах, але быў і ёсць ледзь не апошнім рамантыкам у сваім відзе спорту. Да ўсяго ён заўсёды сумленна і прынцыпова выказваўся па палітычных пытаннях, за што нелюбімы ўладай.

Іншымі вядомымі ў свеце беларускімі шахматыстамі ёсць Сяргей Азараў, Аляксандр Аляксандраў, Вячаслаў Дыдышка (васьміразовы чэмпіён Беларусі, першы раз у 1965 г., апошні праз дваццаць сем гадоў (!) — у 1992 г.), Аляксей Суэцін, Андрэй Кавалёў, Ілля Смірын. З жанчын можна згадаць Кіру Зварыкіну, Генрыету Лагвілаву, Раісу Эйдэльсон. Найбольшых поспехаў дасягнула Зварыкіна, якая двойчы была чэмпіёнкай свету ў камандавым першынстве, а ў 1959 г. — віцэ-чэмпіёнкай у асабістым, пяць разоў яна перамагала ў індывідуальных першынствах СССР. Пазней Зварыкіна таленавіта рабіла па-беларуску адмысловую тэлепраграму. Па яе слядах пайшла і Эльміра Харавец, якая, закончыўшы спаборы, стала арыгінальнай спартовай журналісткай.

На жаль, апошнім часам беларускія шахматысты выступаюць не вельмі ўдала, што і пацвердзілі вынікі сусветнай алімпіяды ў іспанскім горадзе Кальвія, што скончылася днямі. Але шахматная дошка, як і чалавечае жыццё — чорна-белая. Будзем чакаць светлай паласы.

Уладзімір Хільмановіч

Пералом у беларускім фільме

Мастацкі фільм „Акупацыя. Містэрыя" беларускага рэжысёра Андрэя Кудзіненкі выклікаў шмат рознагалосся сярод гледачоў нядаўна закончанага XXIII Кашалінскага фестывалю фільмавых дэбютаў „Маладыя і фільм". Карціна 35-гадовага мінчаніна, народжанага ў Брэсце, ужо раней звярнула ўвагу гледачоў і міжнароднай крытыкі, хоць бы на фестывалі ў галандскім Ратэрдаме, дзе абвясцілі яго сенсацыяй. Як сцвярджае крытык Антон Сідарэнка, „«Акупацыю» можна лічыць першым нацыянальным беларускім фільмам".

— Каб зняць першы фільм аб беларусах, наша кіно патрабавала ледзь не восемдзесят гадоў, — дадае. — Гэта беспрэцэдэнтная падзея для ўсяго беларускага кіно, першы раз у навейшай гісторыі на такім высокім узроўні.

Рэжысёр — адзін з апошніх вучняў легенды „Беларусьфільма" Віктара Турава. Кончыў навуку ў Акадэміі мастацтваў у Мінску. Да рэалізацыі „Акупацыі" гадамі ставіў кароткаметражныя фільмы, якія ўзнагароджваліся на шмат якіх фестывалях. У 2002 г. паставіў поўнаметражны дэбют „Бітва пяці воінстваў".

Падзеі „Акупацыі" разгрываюцца ў 1943 г. у Заходняй Беларусі. Супраціўнікамі становяцца для сябе суседзі — самі беларусы. І хоць выступае тут шмат герояў, найважнейшы з іх — беларускі народ, як звычайна акрэслівае, пад прыгнётам акупанта.

— Каб пачаць новае кіно, трэба было выказацца на старыя тэмы, — падкрэслівае рэжысёр.

У размове з „Нівай" прыгадаў ён, што дагэтуль сусветная вайна прадстаўлялася паводле сцёртых схем і ўсё на Беларусі трактуецца ў ідэалагізаваных катэгорыях сямідзесятых гадоў.

— Мой фільм гэта аповед аб чалавеку, аб народзе, які апынуўся ў экстрэмальнай сітуацыі. Гэта можна аднесці не толькі да Беларусі, але, хоць бы, для прыкладу, да Чачні сённяшняга часу.

Дадае:

— Вайна гэта абсурд. Кашмар, які загадвае людзям пажыраць адны адных. Сапраўдная вайна адбываецца не між арміямі, а між індывідуальнасцямі, нават у іх саміх.

Беларусь у „Акупацыі" гэта месца, дзе сышліся ў кашмарнай сітуацыі дзве таталітарныя сістэмы. Аўтары акрэсліваюць фільм як „экзістэнцыяльную драму з элементамі жахавіка".

„Акупацыя" складаецца з трох навел. Шмат рознагалосся выклікае асоба ненасытнай распуснай полькі-німфаманкі (дэбют ужо цяпер папулярнай Святланы Зелянкоўскай), у якой сексуальную пастку трапляе малады партызан (Аляксандр Малчанаў), якому, як кажа сённяшняя моладзь, да лямпачкі і ягоны атрад, і ўся вайна. Некаторыя палякі, што глядзелі фільм, не хаваюць абурэння:

— Калі ўжо полька, дык прастытутка! — казаў адзін пасля прэзентацыі на кашалінскім фестывалі.

У адной са сцэн ашалелая маці (Алена Сідарава) забітага фашыстамі дзіцяці корміць уласнымі грудзьмі параненага нямецкага салдата (Андрэй Курэйчык). Постаццю, звязваючай матывы — „ліхі баец" Штыркін, тыповы прыклад савецкага касмапаліта і вечнага жуліка-авантурыста. У гэтую ролю бліскуча ўвасобіўся акцёр і рэжысёр Аляксандр Колбышаў. Таксама і іншыя акцёры далі тут майстэрскі паказ варштату, як хоць бы ўспомненая Святлана Зелянкоўская ці Анатоль Кот.

На сайце фестывалю ў Ратэрдаме параўноўвалі „Акупацыю" з легендарнай ужо карцінай Элема Клімава „Ідзі і глядзі". Вобраз Беларусі і беларусаў, якія пастаянна знаходзяцца паміж молатам і накавальняй, у „Акупацыі" часта параўноўваецца да кніг Васіля Быкава.

— Вельмі нам залежала, каб Васіль Быкаў пабачыў гэты фільм як першы. На жаль, дакладна ў дзень завяршэння працы над фільмам гэты вялікі беларускі пісьменнік памёр, — казаў у размове з „Нівай" Андрэй Кудзіненка.

„Акупацыя" не можа быць распаўсюджвана ў Беларусі ў афіцыйным, паўсюдным абароце (у кіно, тэлебачанні). Забаранілі таго чыноўнікі адміністрацыі прэзідэнта Лукашэнкі.

— Было сцверджана, што фільм заадважны, нязгодны з праўдай, кранае пачуцці саратнікаў і ён благі ўзор для моладзі, — прызнаўся нам рэжысёр.

Паўтарагадзінны фільм, аднак, у Беларусі распаўсюджваецца на касетах, адно толькі, што па-пірацку, ад чаго аўтары не маюць прыбытку. Пакуль невядома, ці трапіць ён у польскія кінатэатры. Калі так будзе, зможам яго паглядзець на г.зв. камерных студыйных паказах.

Мацей Халадоўскі

Да юбілею Гайнаўскага беларускага ліцэя

Кузня інтэлігенцыі

Ад самага пачатку свайго існавання беларускае школьніцтва ў Польшчы, па розных прычынах, рабіла, як у нас кажуць, бакамі. І ўсё ж такі ў галіне беларускага школьніцтва зроблена ў нас нямала. Ці ж можна ўявіць сабе, як бы цяпер выглядала наша беларуская меншасць, калі б у свой час не выкарыстаны былі шанцы адраджэння яго і ўтрымання дасюль? З поўнай адказнасцю можна сказаць, што нашае нацыянальнае жыццё было б намнога ўбагажэйшае.

Беларускія ж ліцэі, без лішняй сціпласці, можна назваць кузнямі нашай інтэлігенцыі. Яны мелі таксама станоўчы ўплыў і на тых, хто іх не канчаў і ніколі не вучыўся ў іх. Чуючы пра беларускія школы, кожны мусіў задумацца над тым, хто ён і што ёсць такія людзі, якія не хочуць забываць і выракацца свайго.

Думаю, мелі яны таксама выхаваўчы ўплыў і на польскае, не надта талерантнае грамадства. Звярталі менавіта ўвагу на тое, што ў паўночна-ўсходняй Польшчы жывуць беларусы, якія надалей хочуць быць беларусамі.

Беларускае школьніцтва ў Польшчы, як было ўжо сказана, мела сваіх прыхільнікаў і непрыхільнікаў. Гайнаўскі беларускі ліцэй таксама. Меў, на жаль, сваіх непрыхільнікаў, але меў таксама і прыхільнікаў, ды яшчэ якіх прыхільнікаў. Прывяду некалькі прыкладаў.

У 1998 годзе ліцэй не змог у вызначаны тэрмін заплаціць належнасць за электраэнергію, бо школы нашы бедныя і не заўсёды маюць на час патрэбныя грошы. Падобнае або і большае завінавачанне мелі і іншыя школы. Але адрэзалі святло толькі белліцэю.

Што значыць сучасная школа без электрыкі, тым больш, якая мае вялікую сталовую з мноствам замарожаных прадуктаў, бадай, і гаварыць не трэба. Але просьбы дырэкцыі адтэрмінаваць сплату вынікаў не далі — чыноўнікі былі непрыступныя.

Паратунак прыйшоў... з Францыі. Пра гэты кур'ёзны выпадак нейкім цудам даведаўся рэдактар парыжскай „Культуры" Ежы Гедройц (на жаль, ужо пакойны). І так праняўся справай, што адразу пазваніў сваім высокапастаўленым знаёмым у Варшаву, просячы іх дапамагчы Гайнаўскаму белліцэю. Яны, канешне, абяцалі, але на абяцанках усё і кончылася. Тады Гедройц прыслаў свае ўласныя франкі на пагашэнне даўгу.

Прыслаў таксама свае грошы і выдатны польскі артыст Данель Альбрыхскі і нейкія ананімныя людзі. Так была ўрэгулявана гэтая камічная справа, толькі смурод ад яе астаўся...

Ёсць таксама людзі (яны хочуць астацца ананімнымі), якія, „уфундоўваюць" ліцэю стыпендыі і штомесячна іх выплачваюць...

За ўвесь час свайго існавання Гайнаўскі беларускі ліцэй, як і ўсё нашае беларускае школьніцтва, прайшло складаную і нялёгкую дарогу. Паўсталі яны і ў асноўным дзейнічалі ў часы Народнай Польшчы. Палітыка ж улад Народнай Польшчы была неспрыяльная для нацыянальных меншасцей. Часта, канешне, не без віны саміх гэтых меншасцей, а дакладней кажучы, так званых прадстаўнікоў іхных.

Так што ўзнікла беларускае школьніцтва ў Польшчы і дасюль датрывала толькі дзякуючы выдатным нашым людзям, энтузіястам справы. Сярод іх найбольшая частка — гэта настаўнікі. Гэта ўпарты і ў асноўным моцна адданы справе народ. Тым больш, што хто з іх быў сэрцам аддадны гэтаму школьніцтву, зрабіць так званай кар'еры не мог — яго павышэнні па службе старанна абміналі. І гэта таксама было адной з прычын таго, што многія нашы настаўнікі і вучні ад беларускага школьніцтва шпарка ўцякалі...

Варта адказаць тут яшчэ на адно пытанне: ці варта было працаваць настаўнікам-беларусістам і ўвогуле настаўнікам?

Варта. Нягледзячы на ўсе нявыгады, складанасці і цяжкасці настаўніцкай працы, варта. Што ж можа быць важнейшае і цікавейшае ад навучання і выхавання маладога пакалення?! Што ж можа быць важнейшае і прыгажэйшае ад навучання роднай мовы, літаратуры, культуры, гісторыі ды яшчэ ў такі цяжкі для іх перыяд?! Гэта ўжо не проста навучанне, а місіянерства... Аж дзіва бярэ, што ніводная з нашых правячых эліт гэтага не разумела і ніколі не лічылася з настаўніцкай прафесіяй і тым самым з навучаннем маладога пакалення. Ці ў часы Народнай Польшчы, ці потым. Шкада, бо інвесціраванне ў чалавека, у яго навуку заўсёды дае найбольшыя эфекты.

Якімі ж рысамі павінен быць надзелены настаўнік?

Па-мойму, павінен любіць моладзь і сваю работу, добра знаць яе, быць цярплівым, талерантным і, па меры магчымасці, справядлівым. Хаця настаўніцкая справядлівасць — на маю думку — гэта не значыць ставіць абсалютна адэкватныя ацэнкі з выказанымі ведамі. Калі ў вучня і не зусім яшчэ выходзіць, але бачны старанне, хаценне, высілак, то варта часамі і пахваліць навыраст, і падцягнуць ацэнку, каб падтрымаць на духу. І наадварот, крыху занізіць ацэнку і пажурыць вучня за большыя веды, калі яму пад сілу быць яшчэ лепшым. А як правіла, больш выбачаецца лепшаму вучню, як горшаму. А ўжо школьныя вундэркінды то і ўвогуле своеасаблівым імунітэтам карыстаюцца.

Васіль Сакоўскі

На што грошы?

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Мікола Яноўскі

Вядома, што выдатная большасць земляробаў атрымае даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі і прадукцыі ў цяжкіх умовах гаспадарання (у сярэднім па 600-700 злотых да кожнага гектара). Вытворцы экалагічнага харчавання атрымаюць, дадаткова, крыху большыя даплаты да сваёй прадукцыі. Для тых, што займаюцца сельскагаспадарчай прадукцыяй, стварыліся магчымасці выступаць за дафінансаванне сельскагаспадарчых і агратурыстычных інвестыцый.

Трэба таксама сказаць пра адмоўныя рэзультаты гаспадарання ў еўрасаюзных умовах, якія ўжо сёння бачны. Ад вытворцаў збожжа з Чыжоў і Старога Беразова даведаўся я, што даплаты да іх прадукцыі толькі часткова кампенсуюць фінансавыя затраты. Цана пшаніцы ў параўнанні з мінулым годам панізілася прыблізна на 200 злотых за тону. У сялян Гайнаўскай ці Чыжоўскай гмін, якія збіраюць па 6-7 тон пшаніцы з гектара, даход з гектара атрымаецца меншы (у параўнанні з мінулагоднім) на 1 200-1 400 злотых. Калі дабавіць да гэтага вышэйшыя цэны сродкаў прадукцыі, мінеральных угнаенняў і сродкаў аховы расліннасці, то акажацца, што прадукцыя збожжа стала малапрыбытковай. На даплатах да прадукцыі збожжа могуць скарыстаць гаспадары, якія, сеючы на землях пятага ці шостага класаў жыта або авёс, збіраюць невялікі ўраджай. Крыху павысілася рэнтабельнасць прадукцыі малака, а яшчэ больш — свініны і ялавічыны. Аднак частка гаспадароў не рашылася прыстасоўваць хлявоў да еўрасаюзных патрабаванняў і можна спадзявацца, што ў бліжэйшы час перастануць яны прадаваць малако. Тыя, што справіліся з часовымі патрабаваннямі, будуць вымушаны за некалькі гадоў ізноў перарабляць хлявы. Некаторыя малодшыя гаспадары рашыліся на большыя інвестыцыі і будуюць аборы згодна з еўрасаюзнымі стандартамі. Узялі яны вялікія крэдыты і рашыліся дакупіць больш кароў. Усіх гаспадароў палохаюць бюракратычныя працэдуры, з якімі трэба справіцца выступаючы за якой-колечы дапамогай.

У Гайнаўскім павеце зарэгістраваныя 5 353 гаспадаркі. З гэтага ліку 4 428 гаспадароў выступілі за дапамогай з еўрасаюзнага бюджэту (на 93% зямлі, якая выкарыстоўваецца для сельскагаспадарчых мэт). Амаль 90% з іх атрымае даплаты за гаспадаранне ў цяжкіх умовах. 52 493 гектары зямлі ў Гайнаўскім павеце можна выкарыстоўваць у сельскагаспадарчых мэтах. Аднак паводле апошняга перапісу ажно 9 700 гектараў зямлі ляжыць аблогам.

— Кантролі не выказалі ніякіх няправільнасцей у дакументах, з якімі выступалі гаспадары за даплатамі. Многія нашы гаспадары ўпісвалі нават менш поля, чым выкарыстоўваюць сельскагаспадарча, — паясняе Мікола Яноўскі. — З 18 кастрычніка распачаліся выплаты еўрасаюзных успамог. У Гайнаўскім павеце, у сярэднім, гаспадары атрымаюць па 4 тысячы злотых даплатаў.

На Гайнаўшчыне зарэгістраваны 37 экалагічных гаспадарак і працаўнікі агенцтва спадзяюцца, што будзе пададзена падобная колькасць заяў на атрыманне дадатковых даплат да экалагічнага гаспадарання (усе гэтыя гаспадары атрымаюць таксама падставовыя даплаты). Да пасеянага сёлета збожжа, згодна з экалагічнымі патрабаваннямі, даплацяць па 600-680 злотых да гектара, да лугоў — 260-330 зл., да агародніны — 940-980 зл. Ад наступнага года можна будзе выступаць за даплатамі да ўраўнаважанай сельскай гаспадаркі (па 160 злотых да гектара). Раней сяляне павінны зарэгістраваць ураўнаважанае гаспадаранне, якое абмяжоўвае карыстанне мінеральнымі ўгнаеннямі, хімікатамі і генетычна пераўтворанымі прадуктамі. З наступнага года прадугледжаны даплаты да гаспадарання на прыродных лугах, на якіх расце рэдкая расліннасць або гняздуюцца птушкі. Каб атрымаць грашовую ўспамогу, трэба будзе касіць траву толькі пасля 1 ліпеня. Калі гаспадар рашыцца касіць такую траву ўручную, то атрымае дадаткова 1 030 злотых, а калі будзе касіць машынамі — даплацяць яму 400 злотых (апрача падставовай даплаты).

Ад наступнага года можна будзе выступаць за сродкамі на захаванне старых пародаў кароў (1 080 зл. на адну штуку), коней (1 030 зл.) або авечак (310 зл.). Спачатку спецыялісты мусяць акрэсліць ці гаспадары гадуюць жывёлу, якая раней сустракалася на тэрыторыі Польшчы (напрыклад, чырвоныя каровы або сакольскія коні). Каб атрымаць грошы, трэба будзе мець прынамсі 4 такія каровы, 3 кані і 10 авечак.

Мала асоб зможа пакарыстацца дадатковымі сродкамі на гадоўлю, бо мала традыцыйных пород жывёлы захавалася ў Гайнаўскім павеце.

Аляксей Мароз

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 2 300 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2005 r. upływa 5 grudnia 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

Селянін вязе з сенажаці воз сена. Бачыць: праехаў побач воза матацыкліст без галавы. Праз хвіліну праехаў другі, таксама без галавы, пасля трэці...

— Маруся! — крычыць да сідзячай ззаду жонкі. — Уцягні касу наверх!

* * *

Янка закахаўся ў Марусю і ўпершыню наведвае сваіх будучых цесцяў. Даволі хутка гаспадыня заўважае, што малады госць трасецца ад страху.

— Бачу, — кажа яна, — што вы перапуджаны...

— Неяк не магу асвоіцца...

— Выбачайце! Скажыце пры нагодзе пра сваю прафесію.

— Я з'яўляюся дрэсіроўшчыкам ільвоў.

* * *

Ірынка ўпершыню наведвае дом бацькоў свайго нарачонага. Маці хлопца частуе абедам.

— У нашым доме, — інфармуе гаспадыня, — прынята перахрысціцца перад ежай.

— У нас такога звычаю не было, — адказвае госця. — Мая мама цудоўна варыць!

* * *

Сусед зачапляе Колю:

— Чуў я, што ты памяняў працу...

— Гэта праўда, па прычыне здароўя.

— Нешта табе дакучае?

— Мне нічога, але мой дырэктар, калі толькі мяне ўбачыў, гаварыў, што яму робіцца слаба.

* * *

Паміж сяброўкамі:

— Чаму ты разышлася з мужам?

— Па віне цешчы. У яе выявілася цалкавітая страта сямейных пачуццяў: не хацела даглядаць нам дзяцей.

* * *

Бацька, заўважыўшы, што дачка цяжарная, пытае яе нарачонага:

— Ажэнішся з маёю дачкой ці не?

— Я і не ведаў, што маю выбар.

* * *

— Што гэта — няўдача?

— Калі жанчына знаёміцца са стройным мужчынам і або ён жанаты, або яна замужняя.

* * *

— Што гэта — нечаканасць?

— Калі жанчына ў падарак спадзяецца футра, а атрымлівае калготкі.

* * *

— Якая розніца між мужчынаю і жанчынаю?

— Мужчына можа давесці жанчыну да роспачы, а жанчына мужчыну толькі да шлюбу.

* * *

Між знаёмымі жанчынамі:

— Што чуваць у Андрэя?

— Ад года не размаўляем з сабою.

— Што здарылася: пасварыліся?

— Не, ён ажаніўся са мною.

* * *

— Чаму вы адсутнічалі на рабоце? — пытае дырэктар працаўніцу.

— Бо зламала руку ў двух месцах.

— У будучыні асцерагайцеся гэтых месц.

* * *

— Твая жонка мусіць быць вельмі ашчаднай...

— Відаць гэта па ёй?

— Не: па табе.

Музычная размова

Размова з Сашам — вакалістам беларускага рэп-гурту „IQ-48".

— Адкуль назоў „IQ-48"?

— ... Ой, гэта даўно было, назва радзілася от так звычайна. Проста селі і выдумалі.

— Трэба разумець, што назоў гурту адпаведны да ўзроўню вашай інтэлігентнасці?

— Не! У нас усіх вышэйшая, добрая адукацыя. Проста граем добрую вясёлую музыку.

— Вы ўжо нейкі час існуеце на музычнай сцэне, але альбома яшчэ нельга пачуць?

— Зараз у Мінску працягваем запіс нашай дэбютнай пліткі. Яна амаль завершаная.

— Калі глядзець вашыя канцэрты, зараз на твары з'яўляецца ўсмешка. Вашыя тэксты амаль як кабарэ. Вы вельмі добра ўплываеце на настрой гледача.

— У нашай задуме людзям дорыць весялосць. Шмат гуртоў граюць цяжкую, мінорную музыку, мы — хлопцы вясёлыя. Ёсць і сумныя песні, але агромная большасць з гумарам.

— Ці „IQ-48" трэба лічыць гуртом, які прэзентуе гіп-гоп?

— Раней, калі выступалі з менш жывым саставам, мы іграліі этнагіп-гоп. Зараз тры гады пасля таго, як вырашылі выступаць з жывым саставам, прэзентуем нешта накшталт гіп—гоп, функі, альтэрнатыва.

— Несустракана так іграць у Беларусі...

— Вельмі цікава, калі ты граеш не тое, што грае некалькі іншых гуртоў.

— Апошнім часам зменшылася колькасць спяваючых у гурце „IQ-48". Чаму?

— Ну так, адышоў ад нас зараз вядомы як Пан Жыжма вакаліст. У яго было такое жаданне. На гэты час я сам спяваю. Памяняўся нам і саксафаніст. Папярэдні вырашыў займацца спортам. Але двух вакалістаў гэта не адзін.

— Як ты аднайшоўся ў новай сітуацыі?

— Было цяжка ў адзін момант спяваць самому. Тут трэба і скакаць, і спяваць. Паступова да гэтага ўсё ж я прывык і зараз ніякіх праблем у гэтым пытанні ў мяне няма.

— Ці вам лепш працуецца ў студыі, ці на сцэне з жывой публікай?

— І так, і так. На студыі цікава таму, што тут можна многа выдумліваць. Нейкія фішкі. Калі ідзе пра студыйныя запісы, у нас яны іншыя як канцэртны матэрыял. Паводле мяне, павінна тут быць нейкая розніца, таму што нецікава слухаць на канцэрце ўсё тое што на CD.

Гутарыў Татка Стэп

Музычныя навіны

„Танкі" — так называецца першы беларускамоўны альбом гурту „Нейра Дзюбель". Агульнай канцэпцыяй усяго альбома і з'яўляецца шматзначнасць назвы. І гэта зусім не выпадкова: альбом змяшчае ў сабе многа ўсходніх мелодый, а ў якасці бэк-вакалістаў Алег Хаменка, Лявон Вольскі і Гюнэш Абасава. Усходнія матывы стварае і выкарыстанне такіх інструментаў як дуда, скрыпкі, трубы, з'яўляецца больш гітарных мелодый, знікаюць клавішы. Усяго 58 хвілін.

Як інфармуе музычны сайт www.music.tut.by — гурт „Без білета" выдае альбом „Нарисована", нягледзячы на крадзеж у грамадскім транспарце і спалены камп'ютэрны вінчэстэр. Праца над другім альбомам „Без білета" (першы, „На неба", пабачыў свет у 2001 годзе) цягнулася крыху менш за два гады. І вось — нарэшце! Альбом выйшаў 20 кастрычніка 2004 года.

Татка Стэп

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33							

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Кандрата Крапівы.

1. кустовая расліна сямейства маслінавых з блакітна-ліловымі або белымі пахучымі кветкамі = 3 _ 21 _ 9 _;
2. кракаўская рака = 18 _ 26 _ 24 _ 25 _ 23 _;
3. трэці евангеліст = 12 _ 19 _ 1 _ 2 _;
4. бацька Хама = 6 _ 5 _ 22 _;
5. Хам Ною = 4 _ 28 _ 27 _;
6. сын Ноя = 29 _ 31 _ 30 _;
7. грашовае выражэнне вартасці тавару = 7 _ 8 _ 14 _ 13 _;
8. прыток Дуная, што цячэ з Украіны ў Сербію = 16 _ 15 _ 11 _ 10 _;
9. доўгая вузкая вязаная тканіна або доўгая хустка = 20 _ 33 _ 32 _ 17 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 39 нумара

Ева, жыццё, Кітай, куток, лоб, пуд, указ, Чорны, Югаславія.

Рашэнне: **У які бок кладуцца спіною жывёлы, з таго чакай ветру.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

7.11 – 13.11

Баран (21.03. — 19.04.) Да 7.11. будзь вельмі асцярожны. Будзеш марудны і злосны. Хтось з сямейнікаў залезе табе за скуру. Старайся не начэпліваць на людзей ярлыкі-ацэнкі.

Бык (20.04. — 20.05.) Спачатку знакаміты настрой, шчасце ў дробных справах, лёгкая рэалізацыя планаў. Захопішся кімсьці прыгожым і мілым. Хтосьці верне табе грошы, дапоўняць табе пенсію ці дадуць кампенсату.

Блізняты (21.05. — 21.06.) 9 — 13.11. — ініцыятыва і рэалізацыя з размахам новых мерапрыемстваў. Самаўпэўненасць. Пазнаёмішся з цікавымі людзьмі, даведаешся шмат цікавага. Пазбягай канфрантацый і адкрытых канфліктаў. Пасля 10.11. будзеш ведаць, на чым стаіш.

Рак (22.06. — 22.07.) 12.11. знакамітая нагода знайсці братнюю душу ці наладзіць гарачае знаёмства. 11.11. вызваліцца ў табе агромная энергія — будзеш мець знакаміты настрой. Не раздзірай старых ран, не злуйся на блізкіх 5 — 9.11. Твае сны — поўныя важных сімвалаў.

Леў (23.07. — 22.09.) З 12.11. можаш актыўна і неканвенцыйна ўзяцца за свае справы. Будзеш больш талерантны да чужых хібаў і памылак. Калі паварушыш галавой, вялікія грошы будуць толькі рукой сягнуць.

Дзева (23.08. — 22.09.) Каля 8.11. знаёмыя могуць цябе падвесці. Цяжка дамовіцца з людзьмі, якія не шануюць твайго часу. Будуць прыбываць грошы. Збіраецца на творчыя настроі.

Шалі (23.09. — 23.10.) Каля 8.11. непаладкі з партнёрам; могуць яны давесці да крызісу. Вялікія магчымасці развою і паправы матэрыяльнай сітуацыі, але гонка за грашмі можа ўскладніць табе жыццё — сямейнае і сяброўскае. Мімалётны флірт можа быць выбарам на ўсё жыццё. Рамантычныя сустрэчы пасля 11.11.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) На працы зможаш раскінуць крылы, але не панясуць яны цябе завысока. Твой дыктатарскі ўхіл, бескампраміснасць і патрэба дамінавання ўзмоцняцца яшчэ 7 — 11.11. Энергічныя дзеянні будуць прыгнятаць іншых, некаторыя будуць цябе аж баяцца. Дай адчуць партнёру, што табе на ім моцна залежыць. Скокі ціску крыві.

Стралец (22.11. — 21.12.) 7 — 8.11. асабліва схільны будзеш да вострага абмену думкамі. 7.11. — гармонія ў пачуццях. 12.11. будзеш невясёлы, прыгнечаны (лепш не азірайся назад, бо цяжка будзе табе выбрацца з „нізу"). Можаш адчуць сябе бедным, хоць грошай хопіць.

Казярог (22.12. — 19.01.) Да 9.11. могуць трапіцца складанасці ў прафесійнай кар'еры. Асаблівае шчасце да цяжкага кахання. Ахвота заваяваць свет, добрыя ідэі. Канфлікт у сям'і можна будзе палагодзіць 12.11. Знаёмыя зробяць табе добрую рэкламу.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Будзь асцярожны ў падарожжы 7 — 8.11. Пачуццёвыя праблемы закончацца згодай. Здаючы экзамены, добра да іх падрыхтуйся, прыдасца выкарыстаць практычны бок ведаў і імправізацыю. Можаш мець праблемы з гармонамі.

Рыбы (19.02. — 20.03.) 11 — 13.11. выйдзеш з усіх клопатаў і цяжкіх сітуацый. Фартуна мае для цябе падарунак — спадчыну, дар ці выйгрыш. Падсцерагае цябе асенняя дэпрэсія; займіся тым, што любіш. Мілыя неспадзяванкі ўперамешку з прыкрымі.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960